Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КОМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І САЛДАЦКІХ ДЭПУТАТАЎ І САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

ПЯТНІЦА
15 мая 1931 году
№ 108 (3196)

Алма-Ата, Ленина 81 Гос. Публич. библ-ка Поступ. янв.-32г. Сп.-I

Пад пятой фашысцкай дыктатуры

У 1926 годзе польская буржуазія ...ла на краю пагібелі. Гаспадарчы ...зіс хістаў устоі капіталістычнага ...ту Польшчы. Набліжалася пралетар...я рэвалюцыя. Сотні тысяч рабо...х ня 'мелі работы, галодныя штур...валі магістраты—старостві, патра...валі работы, хлеба. На вёсцы панаваła беззямельле, беспрацоўе, голад. Жорстская расправа буржуазіі над пралетарыятам і працоўнымі масамі ...магла стрымаць рэвалюцыйнай ...лі. Магнаты-капіталісты, абшарні...адчувалі, што пад імі гарыць зямля, што падыходзе канец іх панаваньня, набліжаецца час пралетарскай рэвалюцыі. У гэты момант узрокі буржуазіі былі накіраваны на Пільсудзкага. І Пільсудзкі павёў адданыя яму ...лкі на Варшаву. Пільсудзкі разагнаў буржуазна-кулацкі ўрад Вітасабскага і стаў поўным дыктатарам. Калі салдаты наступалі на Бэльвэдэр (рэзыдэнцыя прэзыдэнта), яны ...чалі: «Бі панаў! Бі буржуазію!» ...ды яшчэ нават хто быў абнятан ...зямі, што Пільсудзкі выратуе з ...ладу, з беспрацоўя, што Пільсудзкі ...ць зямлі беззямельным сялянам. Прайшло 5 год. На вуліцах Варшавы высахлі лужыны крыві рабочых і сялян. Пільсудзкі стаў поўным гаспадаром-дыктатарам. Што-ж атрымаў рабочы і селянін ад фашысцкай дыктатуры Пільсудзкага?

Гаспадарчы крызіс у сучасны момант прыняў катастрафічныя памеры. Фабрыкі і заводы зачыняюцца. Паміж афіцыйных вестак звыш 380 тысяч прамысловых рабочых засталіся ...з работы, а ўсяго беспрацоўных ...ыш мільёну. Рабочыя, замест работы і хлеба, атрымліваюць сьвінец і ...ягайку. Рэвалюцыйныя пралетарскія ...ганізацыі зьнішчаюцца. Звыш 10 тысяч адданьнейшых барацьбітоў за справу рабочае клясы кінуты ў астрог. Для прыдушэньня рабочых фашысцкая дыктатура пасылае атрады ...ліцыі і фашысцкіх дружынынікаў, ...зброеныя газавымі бомбамі, панцыр...ікамі, кулямётамі.

Бядняцка-сераднякія масы сялянства замест зямлі атрымалі карныя экспэдыцыі. Фашысцкі ўрад адбірае ад сялян зямлю пры ліквідацыі сервітутаў (сумесных пасьцьбішчаў) і аддае яе памешчыкам. Непамерна вялікія падаткі руйнуюць дапічэнту бядняцка-сераднякія гаспадаркі. За падаткі забіраюць апошнюю жывёлу, апошнія хапшія рэчы, за няўплату падаткаў накладаюць штрафы, садзяць у астрогі. Фашысцкая дыктатура ўчыніла фармальны пагром рэвалюцыйных рабоча-сялянскіх арганізацый, задушыла пралетарскі друк, руйнуе, вынішчае рэвалюцыйныя прафесыянальныя саюзы.

Фашысцкая дыктатура прывяла Польшчу ў тупік. З гэтага тупіка буржуазія імкнецца знайсьці выхад у яшчэ большым націску на жыцьцёвы ўзровень працоўных мас, у імпэрыялістычнай вайне, ва ўзброеным нападзе на СССР. І ў той час, калі звыш 2000 фабрык зачынена, вясная прамысловасьць прапуе з поўнай нагрузкай, круглыя суткі. Палавіна садраных з працоўных мас грошай з дапаможнага бюджэту ідзе на ўзбраеньне.

Разам з тым фашысцкая дыктатура сьпешна падрыхтоўвае тыл для вайны. Праведзеная «пацыфікацыя» (усьмірэньне) на Заходняй Украіне перакінулася ў Заходнюю Беларусь і нават у каранную Польшчу. Пагромы, зьдзекі, катаваньні і забойствы уведзены ў сыстэму. Цэлыя вёскі зьнішчаны карнымі атрадамі. Тысячы беднякоў і сераднякоў прымушаны ўцякаць ў лес. Тысячы арыштаваных падлягаюць сярэднявяковай інквізыцыі, у васьцянках іх катуюць, зьдзекуюцца і забіваюць. Так падрыхтоўвае спакойны тыл фашысцкая дыктатура да вайны, да якой яна шалёнымі тэмпамі рыхтуецца.

Але белым тэрорам, лютымі катаваньнямі, расстрэламі і пагромамі не ўдалося фашысцкай дыктатуры задушыць рэвалюцыйны рух. Рабочая кляса і бядняцка-сераднякія масы сялянства пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі ўзьнімаюць сьцяг рэвалюцыйнай барацьбы ўсё вышэй і вышэй. Панцырнікамі, кулямётамі і газавымі бомбамі фашыстам не ўдалося разьбіць рэвалюцыйны фронт. Фізычным зьнішчэньнем адданьнейшых барацьбітоў авангарду пралетарыяту—камуністаў—фашысцкай дыктатуры не ўдалося пазбавіць кіраўніцтва рэвалюцыйных мас. Камуністычная партыя расьце і мацнее і пад сваім баявым сьцягам мабілізуе сотні тысяч на барацьбу з фашысцкай дыктатурай беспрацоўя, голаду, за дыктатуру пралетарыяту.

Фашысцкая дыктатура не магла і ня можа выбрацца з эканамічнага крызісу, не магла і ня можа даць рабочым работу і хлеб, а сялянам зямлю. Сёньня, пасьля 5 год панаваньня фашысцкай дыктатуры, гаспадарчы развал капіталістычнай Польшчы прыняў катастрафічны характар. Магутная хваля пралетарскай рэвалюцыі бурліць і панаваньню фашызму надыходзіць нямінучы канец.

За 5 год фашысцкай дыктатуры працоўныя масы адчулі і пазналі на вопыце барацьбы, хто такі Пільсудзкі і каго ён абараняе. Працоўныя масы Польшчы адчулі і адчуваюць увесь цяжар гаспадарчага крызісу, увесь цяжар мілітарнай палітыкі фашызму, адчуваюць клясавае прыгнечаньне.

Вось чаму, пад сьцягам камуністычнай партыі, пад сьцягам пралетарскай рэвалюцыі аб'ядноўваюцца мільёны працоўных Польшчы для рашучай, незамірымай барацьбы з фашысцкай дыктатурай за дыктатуру пралетарыяту. Працоўныя масы Польшчы што раз больш упэўняюцца, што толькі камуністычная партыя, толькі дыктатура пралетарыяту вырве іх з капцюроў беспрацоўя, голаду і белага тэрору. Вось чаму беспрацоўныя пад сьцягам кампартыі штурмуюць магістраты, бастуючыя адбіваюць атакі паліцыі, бядняцка-сераднякія масы сялянства актыўна абараняюцца ад карных экспэдыцый, бо яны пераконваюцца, што ёсьць дзве клясы.— кляса рабаўласьнікаў-крывасмоктаў эксплёататараў і кляса эксплёатуемых, што толькі пэрэмогаю ў рэвалюцыйнай барацьбе клясу эксплёататараў, працоўныя масы здабудуць сабе волю.

У краіну саветаў

(Да прыезду Горкага ў СССР)

Станцыя Негарэлае...

Лічаныя хвіліны засталіся да прыходу польскага цягніка. На пэрон вакзалу высыпаліся людзі — прадстаўнікі партыйных, прафсаюзных і грамадзкіх арганізацый, прадстаўнікі Менскіх фабрык і заводаў, аб'яднаньняў пралетарскіх пісьменьнікаў. Рабочыя-ударнікі, калгасьнікі, чырвоныя пагранічнікі, пісьменьнікі, журналісты прышлі для сустрэчы Максіма Горкага.

Пачуўся звычны паравозны гудок. Неўзабаве паказаўся цягнік. Сотні людзей кінуліся ў бок цягніка, каб убачыць аднаго з лепшых барацьбітоў за перамогу сацыялізму, першага пісьменьніка зямлі Савецкай. Усіх ахапіла хваляваньне...

Цягнік спыніўся ля вакзалу. Аляксей Максімавіч паказаўся на ступенях вагону.

Інтэрнацыянал... Яшчэ вышэй узьнімаецца хваля радасьці працоўных...

— Буравесьніку сусьветнага Кастрычніка наша баявое чэкісцкае прывітаньне!..

— Ура!.. Ура!.. Ура!..

— Першымі пачалі вітаць Максімыча чырвоныя пагранічнікі, — баявыя вартавыя савецкіх межаў.

Стаўшы на апошнюю ступеньку вагона польскага цягніка Аляксей Максімавіч апынуўся на пэроне сярод прадстаўнікоў краіны будуючагася сацыялізму. Калі Максіма Горкага — Халатаў, Гладкоў, Усевалад Іваноў, Леанід Леонаў...

Да адыходу цягніка засталося ½ гадзіны. Гэтыя 30 хвілін былі запоўнены таварыскай гутаркай, якая завязалася паміж Горкім і прадстаўнікамі рабочых дэлегацый, калгасьнікамі, чырвонымі пагранічнікамі.

— Аляксей Максімавіч, раскажэце нам пра тое, што робіцца ў Эўропе, Італіі, Польшчы?..

— Аб Польшчы, — кажа Максімыч, — яна да вас бліжэй чым да мяне. Аб яе становішчы вы лепей ведаеце за мяне. Пра Эўропу... Дык яна перажывае страшэнны крызіс. Галеча, голад, беспрацоўе. Становішча Італіі таксама ня лепшае. Італія перажывае такі-ж самы крызіс, як усе капіталістычныя краіны.

— Ну, а як Аляксей Максімавіч наконт вайны супроць Савецкага саюзу?

— Без вайны ім не пражыць. Але неяк ня верыцца, што яны асьмеляцца пайсьці супроць нас... З тылам у іх справа абстаіць ня зусім добра. Калі пойдуць супроць нас, атрымаюць па пятыліцы. Яны самі добра ведаюць, што вайна супроць СССР — гэта рэвалюцыя...

— А вось, Аляксей Максімавіч, як вы глядзіце на тую кампанію хлусьні, якая вядзецца супроць Савецкага саюзу і супроць вас?

— Гляжу я на гэта вельмі проста... Не па дарозе ім з намі. Клясавы вораг у барацьбе супроць наступаючага сацыялізму скарыстоўвае ўсе сродкі. Арганізацыя хлусьні аб СССР — гэта выпрабаваны і стары сродак сусьветнай контр-рэвалюцыі. А што датычыцца мяне, то чавінен сказаць, што я на тую кампанію хлусьні, якая ідзе на майму адрасу, проста не зьвяртаю ўвагі.

— Ад імя працы да Савецкага Саюзу, — працягвае Аляксей Максімавіч, — ворагі даходзяць да шалёнства. Ёсьць яшчэ на сьвеце такі «сьвяты» чалавек, мітрапаліт Антоні. Ён зьвярнуўся з адозвай да ўсіх праваслаўных, ў якой напісаў, што ён «волей, данной яму самим господом богом разрешает резать и вешать большевиков». Я яму, зразумела, напісаў пару слоў і запытаўся ў яго: «как-же это, «папаша», вы же христианин...»?

— Я, як вам вядома — працягвае Максімыч, прымушаны знаходзіцца і пражываць у далёкай Італіі. Але будзьце упэўнены, што я пільна сачу за вялікім будаўніцтвам, якое разгортваецца ў Саюзе Саветаў... Тое, што краіна саветаў зрабіла за апошнія два гады, зьдзіўляецца больш чымся цудам... Асабліва мяне радуюць посьпехі, якія атрыманы СССР у справе перабудовы вёскі на калектыўных пачатках. СССР уяўляе сабою магутную энэргію творчых сіл. Мы ідзем, ды яшчэ як моцна ідзем наперад...

Хвіліны бягуць. Набліжаецца час адыходу цягніка. Максімыч усхвалёваны таварыскай сустрэчай. Усхвалёваны рабочыя-ударнікі, калгасьнікі, пісьменьнікі, журналісты, дзеці. Бязмежная радасьцю пакрыты твары працоўных, якія ў асобе Максіма Горкага бачаць свайго блізкага таварыша па барацьбе.

— А вы-бы, таварышы, расказалі аб чым небудзь мне. Раскажэце мне, што ў вас новага?..

І тут узялі ініцыятыву ў свае рукі чырвоныя пагранічнікі.

— Мы, кажуць чырвоныя пагранічнікі, — бярэм з вас прыклад, змагаемся за ўдарныя тэмпы. Год таму назад наш атрад абвесьціў сябе ўдарным. Праз некалькі дзён мы будзем сьпяткаваць гадавіну ўдарнай работы. У нас усе ўдарнікі. Змагаемся за вывучэньне тэхнікі. Вайны ня хочам, але калі прыдзецца даць адпор, дык дамо. І дамо так, што ўсім чарцям моташна стане.

— Вы бы, Максімыч, напісалі-б нам што-небудзь?

— Напішу, абавязкова напішу... Дайце мне аловак. Запішу ваш адрас.

Да вакна вагону падышоў прадстаўнік дэлегацыі рабочых заводу імя Варашылава. Затрашчалі кіно-апараты. Забегалі фатографы. Людзкое кола вакол вагона самкнулася яшчэ шчыльней.

— Дазвольце, Аляксей Максімавіч перадаць вам ад імя брыгады такароў вашата імя шчырае таварыскае прывітаньне. Яшчэ дазвольце перадаць вам прывітаньне ад тысячнай армії рабселькораў Савецкай Беларусі. Вось Вам на ўспамін — наша газэта, якая творыцца ўдарнікамі рабселькорамі...

Слухаючы уважліва апавяданьне рабочых ударнікаў, калгасьнікаў, чырвоных пагранічнікаў, захапляючыся вялікімі перамогамі, Аляксей Максімавіч з захапленьнем гаворыць:

— Маладая краіна, малады народ, магутны народ, гэтакая «силища»... У вас усе маладыя... У вас няма старых.

Падаўся сігнал да адпраўкі цягніка. Пад гукі моцнага ура і вайсковага аркестру разьвітаўся Максім Горкі з негарэльскай грамадзкасьцю. Цягнік узяў поўны ход і пераключыўся на самую вялікую хуткасьць.

У часе праезду паміж Негарэлым і Менскам Горкі доўга гутарыў з дэлегацыяй рабочых Менскіх прадпрыемстваў з прадстаўнікамі ад пісьменьнікаў журналістаў і інш. Дэлегацыя рабочых Менскіх прадпрыемстваў пра рабязна знаёміла Горкага з тымі дасягненьнямі, якія маюцца ў выказаньні прамфінпляну трэцяга рашаючага году, які зьяўляецца годам заканчэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі ў СССР. Горкі азнаёміўся з тымі дасягненьнямі, якія мае БССР на фронце стварэньня культуры нацыянальнай па форме, сацыялістычнай па зьместу.

Цягнік падыходзіў да ст. Менск. Тысячныя калёны Менскіх пралетараў-ударнікаў са сьцягамі, плякатамі, лёзунгамі прыйшлі на вакзал сустрэць свайго Аляксея Максімавіча. Цягнік спыніўся.

— Няхай жыве наш Горкі!

Горкі, стоячы ў вакне вагону, гэстамі сваіх рук адказвае на бурныя і шматлікія прывітаньні.

Ад імя пралетарыяту і працоўных БССР Горкага вітае радактар газ. «Зьвязда» тав. Будзінскі.

— У асобе тав. Горкага мы вітаем першага пралетарскага пісьменьніка нашай краіны. Ён вырас з нашага асяродзьдзя, ён плоцьцю і крывёю— ад рабочае клясы. Усё сваё жыцьцё Горкі аддаў справе рабочай клясы, справе пралетарскай рэвалюцыі.

Зараз, калі капіталістычныя краіны пры дапамозе сацыял-фашыстаў, рыхтуюць інтэрвэнцыю супроць СССР, Горкі штодзённа выкрывае замыслы імпэрыялістаў, заклікае працоўных усяго сьвету выступіць на абарону пралетарскай бацькаўшчыны.

Вось чаму кожны прыезд Горкага ў нашу краіну — сьвята для пралетарыяту і працоўных БССР і ўсяго Савецкага Саюзу...

Ад імя навуковых працаўнікоў БССР вітаў Аляксея Максімавіча тав. Вальфсон.

— Мы толькі што віталі Максіма Горкага на ст. Негарэлае. Некалькі слоў гутаркі з Горкім уліў у нас яшчэ больш энэргіі, яшчэ больш энтузіязму для сацыялістычнага будаўніцтва якое разгортваецца шпаркім тэмпам у нашай краіне...

— Мы заклікаем усіх працоўных жыць, як жыў Горкі. працаваць па горкаўскаму, змагацца так за справу рабочае клясы, як змагаўся ён і змагаецца зараз за справу сусьветнай рэвалюцыі.

Пад гукі аркестру і бурныя крыкі «ўра» цягнік павольна адышоў ад станцыі.

Калёны Менскіх пралетараў стаялі, пакуль ня скрыўся цягнік...

Разайшліся з бадзёрымі песьнямі.

Я. Я—скі.

Пралетарскія кадры— бальшавіцкай пяцігодцы

Адказ гомельскіх рабфакаўцаў на адозву рабочых тульскага заводу № 1

Да ўсяго пралетарскага студэнцтва, да ўсіх навуковых працаўнікоў і выкладчыкаў БССР

Таварышы!

У дзень першага мая, у другую гадавіну сапсаборніцтва, калі рабочая кляса Савецкае краіны пад кіраўніцтвам Ленінскай Камуністычнай партыі сталёвамі калёнамі ўпарта змагаецца на франтах пяцігодкі за пасьпяховае завяршэньне фундаманту сацыялістычнай эканомікі, калі перадавыя атрады пралетарыяту СССР даюць узоры небачаных бальшавіцкіх тэмпаў працы ў выкананьні пяцігодкі ў 2½ гады, калі на базе суцэльнай калектывізацыі ліквідуецца апошняя капіталістычная кляса—кулацтва.

Мы, тысячны атрад студэнтаў і настаўнікаў Гомельскага Рабфаку. Мэханіка — Машынабудаўнічага Інстытуту у адказ на зварот тульскіх рабочых выяўляем нашы дасягненьні і недахопы і правяраем нашу баяздольнасьць на фронце падрыхтоўкі пралетарскіх кадраў.

Нам вядома

што лічбы 518 і 1040, якія характарызуюць гігантскі рахмах вольнай сацыялістычнай працы у СССР патрабуюць яшчэ і такіх лічбаў—у гэтым жа годзе даць краіне 300 тысяч тэхнікаў і 125 тысяч інжынэраў, сотні тысяч настаўнікаў. Гэтая гігантская задача будзе выканана толькі тады, калі ўся справа падрыхтоўкі пралетарскіх кадраў будзе пераведзена на сапраўдныя бальшавіцкія тэмпы.

Мы дабіліся

шляхам разгортваньня сапраўднабальшавіцкіх тэмпаў працы высокага ўзроўню пасьпяховасьці—94 проц, пасьпяваючых, 5,26 проц. адстаючых і толькі 0,74 проц. непасьпяваючых.

Нашы акадэмічныя пляны выконваюцца поўнасьцю, а па раду груп, на падставе высунутых сустрэчных плянаў—перавыконваюцца, што дае магчымасьці гэтым групы выпусьціць на 6—9 месяцаў раней тэрміну (за 2½ гады) ня зьніжаючы пры гэтым якасьці працы.

Увесь дзенны рабфак ад 4 гадоў навучаньня перайшоў на 3 гады. З пераводам працы на трымэстровую сыстэму мы дабіліся лепшай пасьпяховасьці і больш чоткага выкананьня навучальных плянаў.

— Штодзённая палітычная мабілізацыя студэнцтва вакол генэральнай лініі партыі і перавод працы на вышэйшую ступень (акадэмштурм, месячнік барацьбы за якасьць)—далі вялізарны размах сапсаборніцтва і ўдарніцтва сярод студэнтаў.

— Прагулы зьнішчаны, спазьненьні, якія ў першым трымэстры выражаліся ў лічбе 5 проц., зараз даведзены да 0,3 проц.

— Мы прымалі і прымаем актыўны ўдзел ва ўсіх важнейшых палітычных кампаніях. Мы ўзялі ў сакавіку г. г. шэфства над калгасам «Бальшавік» і над Уцеўскім сельсаветам, Церахоўскага раёну, для правядзеньня арганізацыйнай і культмасавай працы. Так сама былі дасланы 2 брыгады кавалёў для рамонту с.-г. інвэнтар.

У выніку гэтае працы, разам з мясцовымі арганізацыямі арганізаваны у сельсавеце 4 новых калгасы і ўсяго павялічыўся на 112 гаспадарак, што складае 55 проц. усёй колькасьці гаспадарак сельсавету.

— Праведзена падрыхтоўчая праца да вясеньняй сяўбы.

Праведзена 5 суботнікаў. Сабрана на трактарную калёну 1.300 руб. на дырыжабль—1.000 руб.

— Рабфакавец вячэрнік—ударнік на вучобе—зьяўляецца лепшым ударнікам і на вытворчасьці.

— Зроблены рашучы паварот у справе марксыцка-ленінскага ўзбраеньня і насычаньня навучальных праграм сучаснасьцю. Пытаньні пяцігодкі, калектывізацыі і абароназдольнасьці ўсё больш аллюстроўваюцца нашымі вытворчымі плянамі.

— Анты-ленінскія ідэі ў нацпытаньні, праявы вялікадзяржаўнага шавінізму, контррэвалюцыйнага нацыянал-дэмократызму і яўрэйскага шавінізму, фармальныя адносіны да беларусізацыі, апартуністычная практыка і ўсялякія адхіленьні ад генэральнай лініі партыі—сустракалі бязьлітасны адпор з боку усёй студэнцкай і настаўніцкай грамадзкасьці.

— Мы вядзем рашучую барацьбу з апалітычнасьцю, якая сустракаецца ў асобных выкладчыкаў з меншавіцкімі і ідэалістычнымі канцэпцыямі ў выкладаньні.

Нашы недахопы

Яшчэ недастаткова рацыянальна выкарыстоўваецца рабочы час.

5 проц. адставаньня (хвастоў) сьведчыць яшчэ аб наяўнасьці браку ў нашай працы.

Лёзунг Сталіна аб аўладаньні тэхнікай яшчэ не знайшоў свайго канкрэтнага адбітку ў працы рабфаку.

Настаўнік яшчэ ня стаў сапраўдным удзельнікам ударнай студэнцкай брыгады.

Ня ўсе настаўнікі ўключыліся ў грамадзка-палітычнае жыцьцё рабфаку.

Мэтадычная праца рабфаку адстае ад агульных тэмпаў і ня стала яшчэ адным з магутных сродкаў пераводу ўсёй працы на новыя рэйкі.

Слабым месцам зьяўляецца культмасавая праца сярод студэнцтва, якая значна адстае ад тых запатрабаваньняў, што высоўваюцца сучаснасьцю.

Бярэм на сябе абавязак

Да канца навучальнага году:

1) Перадаць вышэйшым навучальным установам да пачатку 1932 г. датэрмінова 120 добра падрыхтаваных студэнтаў.

2) Зьнішчыць брак нашай прадукцыі. Наш лёзунг: «Ніводнага адстаючага».

3) Не пазьней 15-га чэрвеня падрыхтаваць усе праграмы і пляны да будучага навучальнага году і прыстасаваць іх да атрасьлёвай спэцыялізацыі рабфаку.

4) Прапусьціць увесь настаўніцкі склад праз сэмінар і вытворчую практыку на заводзе з мэтай аўладаньня элемэнтамі тэхнікі.

5) Узмацніць ваенізацыю рабфаку. Арганізаваць для студэнтаў і выкладчыкаў лягерны збор у чэрвені мес.

6) Усе выкладчыкі замацоўваюць сябе на рабфаку да канца пяцігодкі.

7) Кожны студэнт вячэрняга рабфаку бярэ на сябе абавязак даць ня менш двух прапаноў па рацыяналізацыі вытворчасьці.

Таварышы! Тое, што мы дабіліся—гэта вынік упартага змаганьня студэнцкага і настаўніцкага калектыву пад кіраўніцтвам партарганізацыі за ленінскую лінію партыі.

Трэба памятаць, што фронт падрыхтоўкі кадраў—гэта фронт клясавай барацьбы. Новыя пролетарскія кадры есьць удар па клясаваму ворагу і яго агентуры. Лепшай, узорнай працай, упартай барацьбой за тэмпы і якасьць, аўладаньнем навукай і тэхнікай—адкажам Рамзіным, Лёсікам, Громаным і інш. шкоднікам на іх агідныя контррэвалюцыйныя спробы сарваць справу сапбудаўніцтва.

Таварышы! Рабочая кляса патрабуе ад усіх мас адданейшай упартай працы. Будзем раўняцца па героях пяцігодкі—электразаводцах, бакінцах і тульскіх пралетарыяў.

Наперад—да новых перамог!

Няхай жыве УсеКП(б) і яе Ленінскі ЦК на чале з тав. Сталіным!

(Абгаворана і прынята на вытворчых нарадах і агульных сходах студэнтаў і выкладчыкаў дзеннага і вячэрняга рабфакаў.

Горацкаму рабфаку

На вялікі жаль прыехаць не змагу. Вітаю вас таварышы са скончэньнем курсу пралетарскай вучобы. Вы ўдарнікамі былі на вучобе ў рабфаку, спадзяюся, што ўдарнікамі застанецеся і ў ВНУ і на працы па сацыялістычнай будоўлі.

Камуністычная партыя патрабуе ад усіх нас аўладаць тэхнікай, таму перад вамі стаіць гэтая важнейшая задача за ўвесь свой рост. Дзяржаве патрэбны новыя пралетарскія кадры вучоных і тэхнікаў—ваша група выпускнікоў павінна зьявіцца ўдарнай калёнай арміі пралетарскіх спэцыялістаў.

За высокія тэмпы індустрыялізацыі краіны і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, за пяцігодку ў чатыры гады—такі лёзунг стаіць перад вамі у час вучобы.

З таварыскім прывітаньнем М. Галадзед.

РЭВАЛЮЦЫЙНАЯ ХВАЛЯ Ў ГІШПАНІІ ЎЗДЫМАЕЦЦА ВЫШЭЙ

па ўсёй краіне ваеннае палажэньне. У буйнейшых прамысловых цэнтрах абвешчана ўсеагульная забастоўка

НА ТЭРОР ЧАСОВАГА ЎРАДУ СУПРОЦЬ РАБОЧЫХ МАРАКІ АДКАЗВАЮЦЬ ПАЎСТАНЬНЯМІ

ЛЁНДАН, 12. Крэдыт часовага Гішпанскага ўраду мяркуючы па атрыманых зьвестках з Гішпаніі рэзка падае. Нерашучасьць ураду, няпэўнасьць яго палітыкі становіцца ўсё больш і больш зразумелай, захаваньне Замора дае рабочым ня больш, чым дыктатура манархісцкіх генэралаў.

Рост колькасьці забастовак ва ўсіх краінах Гішпаніі сьведчыць, што сярод рабочых расьце палітычная сьвядомасьць, што рабочыя ня толькі дабіліся палепшаньня ўмоў працы, але і змагаюцца і за палітычныя патрабаваньні. Надзвычайна сымпатычны той факт росту рэвалюцыйных настрояў сярод маракоў гішпанскага флёту, які адказаў хваляваньнямі і паўстаньнямі на арышт некалькіх сот. У флёце падае дысцыпліна. Шмат якія маракі пакідаюць флёт. Часовы ўрад, разумеючы, што на флёт ён спадзявацца ня можа, усё больш і больш абтраецца на прамадзянскую гвардыю, якая надзвычайна рэакцыйная, хоць і аказвае падтрыманьне рэспубліканскаму ўраду.

Манархісты і клерыкары, карыстаючыся мяккасьцю ўраду, трымаюць сябе адкрыта правакацыйна. Манархісты настаялі, каб урад аслабаніў генэрала Берэнгера. Але забягаючы ласкі перад манархістамі, Замора ня ўлічыў настрою мас, якія адказалі на гэты акт ураду стыхійным выбухам абурэньня. Былі спалены шэсьць каталіцкіх манастыроў. Шмат манастыроў эруйнавана. Замора абвясьціў Мадрыд на ваенным палажэньні і прыбегнуў да дапамогі грамадзянскай гвардыі для жорсткага прыдушэньня дэманстрацый. Аднак, жорсткасьці грамадзянскай гвардыі толькі распалілі абурэньне мас. Рэвалюцыйны рух пашоў на новаму руслу: супроць часовага ўраду. Былі высунуты патрабаваньні аб адстаўцы міністра ўнутраных спраў Мауры аб роспуску грамадзянскай гвардыі. Прэсьцыж ураду рэзка паў. У той час як урад сьцьвярджае, быццам ён у Мадрыдзе аднавіў парадак, атрымліваюцца зьвесткі аб сур'ёзных хваляваньнях у Кадыксе, Аліканто, Малазе, Кардове, Пэрыле і Барсэлёне, прычым скрозь мелі месца напады на манархісцкія і інш. рэакцыйныя газэты.

У Барсэлёне палажэньне асабліва абвострылася ў сувязі з прыходам у горад некалькіх тысяч галадаючых сялян з бліжэйшых раёнаў. Баючыся ўзмацненьня хваляваньняў, губарнатар загадаў чыгуначным кампаніям арганізаваць ахрану.

Манархічныя асяродкі—манастыры руйнуюцца і паляцца

ПАРЫЖ, 12. Агенцтва Гавас паведамляе, што ў Цэвільі была падпалена іезуіцкая царква. Прыбыўшыя пажарныя і грамадзянская гвардыя былі сустрэнуты дэманстрацыяй. Дэманстранты прымусілі пажарных і гвардыю рэтыравацца. Пасьля гэтага былі спалены яшчэ два манастыры. Духавенства схавалася ў прыватных дамох.

У Аліканта было разгромлена інтэрнат іезуітаў, 7 манастыроў, дзьве друкарні рэакцыйных газэт і епіскапаўскія палацы. У Кадыксе былі падпалены 4 манастыры, войскі пачалі стрэльбу. У горадзе сярод буржуазнага насельніцтва страшэнная паніка. У Малазе дэманстранты ноччу спалілі два манастыры і епіскапаўскія палацы.

***

ПАРЫЖ, 12. Як паведамляе агенцтва Гавас, у Мадрыдзе арыштавана два члены ЦК манархісцкага саюзу і лідэры нацыяналістычнай партыі Альбіна.

У Грэнадзе ўзарвана частка манастыра і зроблена спроба падпаліць манастыр ордэна марыстаў, а таксама памяшканьне рэдакцыі газэты «Юга». Мадрыдзкая фэдэрацыя рэвалюцыйных прафсаюзаў зьвярнулася да ўраду з патрабаваньнем вызваліць арыштаваных членаў фэдэрацыі, распусьціўшы грамадзянскую гвардыю і «ахранную гвардыю», прыступіўшы да ўзброеньня народу, выгнаць манархістаў, экспропрыраваць іх маемасьць і адмяніць асаднае палажэньне.

У Малазе, ня гледзячы на асаднае палажэньне дэмастранты спалілі манастыр, а потым разграмілі цэлы рад манашаскіх устаноў. Манархісцкая газэта «Уніён» закрыта. З Сэвільі і Аліканто паведамляюць аб аднаўленні супакою.

Крывавыя бойкі рабочых з паліцыяй

ПАРЫЖ, 12. Як паведамляе агенцтва Гавас з Мадрыда, у Валенсыі абвешчана ваеннае палажэньне. Войскі занялі манастыры.

У Кардове ўзьнікла перастрэлка паміж паліцыяй і дэманстрантамі, якія падпальвалі манастыр. У выніку гэтай сутычкі 3 чал. забіты, 5 ранена. Пажарным удалося спыніць агонь. У часе сутычкі з паліцыяй шмат дэмонстрантаў ранена, прычым некаторыя цяжка. Сутычка цягнулася больш паўгадзіны. Усяго забіта 5, ранена—25 чал. У горадзе абвешчана ваеннае палажэньне. Да Кардова накіраваны войскі на выпадак забастоўкі.

У Сэвільі паліцыя страляла па дэманстрантах, якія спрабавалі ўзяць прыступам манастыр ордэна капуцынаў. Адзін дэманстрант цяжка ранены. У Сэвільі таксама абвешчана ваеннае палажэньне.

ПАРЫЖ, 12. У Грэнадзе ноччу пажарам зьнішчана іезуіцкая царква, памяшканьне рэдакцыі газэты. У горадзе абвешчана ваеннае палажэньне.

ЗАБОЙСТВА ФАШЫСТАМІ ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНАГА Т. ПІРОЦКАГА

Агалцелая фашысцкая зграя фізычна зьнішчае авангард пралетарыяту Польшчы

ВІЛЬНЯ. Пры спробе ўцяканьня з цягніка загінуў гэтымі днямі палітзьняволены Піроцкі, якога з правінцыяльнай турмы перавозілі ў турму ў Вільню.

Цела яго ня было выдана ўладам. Па патрабаваньні паліцыі, для ўхіленьня дэманстрацыі, пахаваньне адбылося ўночы з 10 на 11 мая, прычым пахавальная працэсія праваджалася вялікім атрадам паліцыі. Ня гледзячы на ўсе гэтыя перасьцярогі, віленскія рабочыя арганізавалі ў часе пахарон дэманстрацыю прыбыўшы вялізарнай масай. Пры магіле Піроцкага пакінута паліцэйская варта. Вечарам 11 мая адбылася дэманстрацыя ў цэнтры гораду па Нямецкай вуліцы.

Ноччу-ж паліцыя знайшла вывешаныя на провадзе трамваю транспарацыі з надпісам: «сьмерць фашысцкім катам».

***

Фізычнае зьнішчэньне рэвалюцыянэраў, адданейшых барацьбітоў за справу рабочае клясы, фашысцкая зграя ўвяла ў сыстэму. Гэта ня першы выпадак, калі забіваюць закутага па руках і нагах палітзьняволенага і ў паліцэйскіх цыркулярах адзначаюць «пры спробе ўцячы забіты». Гэтая «уцечка» добра прадумана ў ахранцы. Каты-крывапійцы каб апраўдаць забойства спасылаюцца на «уцечку».

Але хто паверыць зграі шпікоў. Хто паверыць забойцам? Зразумела, што гэта халодны, загадзя абдуманы акт, загадзя падрыхтаваны у габінэтах фашысцкіх забойцаў. Такія паведамленьні былі і ў часе забойстваў на Заходняй Украіне, такія паведамленьні былі, калі дэфэнзыва забівала ў засьценках Луцкай ахранкі, такія паведамленьні былі, калі вешалі палітзьняволеных і забівалі ў турмах.

Рабочая кляса і працоўныя БССР агнём нянавісьці, магутнай хваляй пра пратэсту адкажуць на фізычнае зьнішчэньне фашысцкімі катамі лепшых адданейшых барацьбітоў за справу сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі.

Царква прызывае „аб'яднацца для барацьбы за захаваньне існуючага ладу і рэлігіі"

ПАРЫЖ. Правая «Тан» публікуе «пастарскае пасланьне» галавы гішпанскай царквы кардынала Сэгура.

Адзначаючы, што ў часе манархіі «правы царквы заўсёды паважаліся», Сэгура выказвае сваю ўдзячнасьць былому каралю Альфонсу 13 «добраму хрысьціяніну і прыкладнаму гішпанцу». Не адважваючыся адкрыта заявіць аб сваёй гатоўнасьці падтрымаць манархію, Сэгура піша: «царква павінна ўстрымацца ад разважаньняў аб форме дзяржаўнай улады». Тым ня менш, Сэгура кіруе ў сваім пасланьні адкрыты выклік да барацьбы: «калі ворагі хрыстовы,—піша ён,—пяройдуць у адкрытае наступленьне ніводзін з католікаў ня зможа застацца ў бядзейнасьці». Сэгура заклікае католікаў «абараняць рэлігію і бацькаўшчыну», Сэгура заклікае католікаў ўдзельнічаць ва ўсіх адміністрацыйных палітычных установах. У асаблівасьці—падкрэсьлівае Сэгура—гэта неабходна ў сувязі з прадстаўчымі выбарамі ў Фарыцтэце Парлямэнт Сэгура заклікае ўсіх католікаў—манархістаў і рэспубліканцаў—«аб'яднацца для барацьбы за захаваньне існуючага сацыяльнага ладу і рэлігіі, якія знаходзяцца пад пагрозай».

Напад паліцыі на мітынг рабочых

ВАРШАВА, 13. Польскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе, што 10 мая вечарам палітычная паліцыя арыштавала ў лесе ў ваколіцах Лодзі 60 удзельнікаў мітынгу, быццам арганізаванага Лодзінскім камсамолам.

На мітынгу было сказана рад прамоў. Разам з тым моладзь выгукала лёзунгі ў гонар Савецкага саюзу і клялася абараняць СССР ад нападу польскай буржуазіі.

Усе саўгасы—на гаспадарчы разьлік!

Мабілізаваць вакол гэтага пытаньня грамадзкую думку рабочых

Гаспадарчы разьлік не знайшоў яшчэ сабе месца ў саўгасах

Гаспадарчы разьлік—гарантыя выкананьня прамфінпляну

Вялізарнае палітыка-эканамічнае значэньне пераводу прадпрыемстваў на гаспадарчы разьлік бясспрэчна даказана і праверана жыцьцём. Гаспадарчы разьлік—лепшы вагар кіраўніцтва гаспадаркамі. Кантроль рублём ёсьць гарантыя выкананьня прамфінпляну. Ажыцьцяўленьне гаспадарчага разьліку будзе рэальна садзейнічаць хутчэйшаму выяўленьню слабых вучасткаў работы, зьніжэньню сабекошту, падвышэньню выхаду таварнай прадукцыі, росту прадукцыйнасьці і якасьці працы, больш шырокаму ўкараненьню практыкі шырокага сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

Важнейшай часткай пераходу на гаспадарчы разьлік зьяўляецца заключэньне дагавораў, устанаўленьне такіх дагаворных адносін, якія забясьпечылі-б матар'яльную адказнасьць, рэальна зьвязалі-б гаспадарчыя арганізацыі, зьявіліся-б лепшай гарантыяй выкананьня прамфінпляну.

Кампанія заключэньня генэральных дагавораў у асноўным закончана, але вельмі марудна праходзіць заключэньне лёкальных дагавораў.

Гэта работа толькі пачынае разгортвацца. Па будаўніцтве падпісана лёкальных дагавораў 36, замест 74, на здачу таварнай прадукцыі мяса—7, замест 67, па малаку—13, замест 69, і інш. Добра справіўся з гэтай задачай новаарганізаваны саўгас Саматэвічы, які ўжо да 7-га мая падпісаў дагаворы з Белсельбудам, Белмясам Саюзмалаком і Мэлітрэстам, чым ня могуць пахваліцца шмат-якія старыя саўгасы.

Рад саўгасаў не заключылі дагавораў

Рад саўгасаў зусім не далі вестак аб ходзе гэтай работы, ма' быць з тае прычыны, што зусім не пачаты пераход на гаспадарчы разьлік. Некаторыя саўгасы рабілі спробу адкласьці заключэньне дагавораў, зьменшыць дагаворныя абавязацельствы, зварочваючы мала ўвагі на дэталізацыю паасобных пунктаў. Дырэктар саўгасу «Зара Захаду» Яраш у дагаворы на будаўніцтва сьвінарнікаў вызначыў тэрмін пачатку і канца пабудовы, замест вызначэньня каляндарнага тэрміну на кожны будынак. Саўгас Ялова спрачаўся трое сутак, патрабуючы прызначэньня намесьніка загадчыка будаўніцтва на пасаду памоцнікa дырэктара па будаўніцтве. Рад саўгасаў просіць вынісьці ім заданьне замест тато, каб узяцца за мабілізацыю ўсіх рэсурсаў і выканаць прыняты рэальны плян.

Шмат раённых арганізацый не падрыхтавалася да заключэньня дагавораў. Дырэктар саўгасу «Будзёнавец» піша: «Сёньня трэці дзень затрацілі на заключэньне дагавораў з раённымі арганізацыямі, але ніхто нічога не падрыхтаваў». «Гомрайсаюз адмовіўся ад падпісаньня дагавораў на бульбу», па ведамляе дырэктар саўгасу Васільеўск.

Трэба моцна ўдарыць па гэтай цегаціне. Веснавая пасеўная і апаросная кампаніі і будаўніцтва патрабуюць суровага пакараньня за самы нязначны адклад заключэньня дагавораў... Дагаворы павінны быць закончаны ў бліжэйшыя дні.

Пераход на гаспадарчы разьлік патрабуе перш за ўсё разгортваньня масавай работы. Правільны і поўны пераход на гаспадарчы разьлік можа быць ажыцьцяўлён толькі пры ўмове поўнай мабілізацыі вакол гэтай задачы ўсёй саўгаснай грамадзкасьці. Гэтага мы ня маем. Мы ня можам сёньня прызнаць, што кожны ўдарнік, кожны рабочы, спэцыяліст, нават дырэктар і ўвесь прыкутнік усьвядомілі важнасьць пераходу на гаспадарчы разьлік.

Наладзіць грамадзкі кантроль над выкананьнем дагавораў

Па-новаму павінны пачаць сваю работу вытворчыя нарады. Работа іх павінна быць перанесена ў першую чаргу ў цэхі і групы. Сучаснае становішча іх работы зусім не адпавядае задачам гаспадарчага разьліку. Пераход на гаспадарчы разьлік ня можа мірыцца з такой практыкай мабілізацыі мас, калі саўгасы «Беларусь» і «Камунар» з сакавіка па сёньнешні дзень не маглі спаткацца для заключэньня сацдагавораў. У гэтых саўгасах адсутнічае сацспаборніцтва, не выдаюцца насьценныя газэты, прысьвечаныя сяўбе.

Павінен быць устаноўлен грамадзкі кантроль; трэба ўжо арганізаваць рабочыя брыгады для сыстэматычнай праверкі ходу выкананьня дагавораў. Гаспадарчы разьлік патрабуе ад усяго трыкутніка саўгасаў, каб кожны саўгас, кожны цэх, кожная брыгада былі ўдзельнікамі сацыялістычнага спаборніцтва і сапраўды ўдарнай работы. Гаспадарчы разьлік патрабуе выкананьня пляну, тэмпаў і якасьці сяўбы. Гэта патрабуе ўзмацненьня тэмпаў сяўбы і рашучай барацьбы за высокія якасныя паказьнікі сяўбы.

Тэмпы сяўбы яўна нездавальняючыя

Трэба рашуча ўзмацніць тэмпы сяўбы. Весткі аб ходзе на 10-га мая паказваюць, што масавая сяўба яшчэ не пачалася. Для некаторых саўгасаў, як **Жалезьнякі, Насовічы, Старая Беліца, Молатава, Калініна, Васільеўск** і інш. засталося толькі 7 дзён да канца сяўбы, а належных тэмпаў няма. У бліжэйшую пяцідзёнку трэба ў аснове выканаць увесь плян сяўбы. Трыкутнік саўгасаў павінен зразумець, што існуючыя тэмпы зрываюць гаспадарчы разьлік, што трэба ўсю работу па будаваць па новаму, па ўдарнаму і ня толькі на трактарах, але і складаных машынах сеяць у 3 зьмены, мабілізаваць усе ўнутраныя рэсурсы, датэрмінова скончыць сяўбу і аказаць рэальную дапамогу калгасам.

Гаспадарчы разьлік і зьдзельшчына

На рабочую сілу зараз выдаткоўваецца разам з будаўніцтвам каля 15 млн. Кожны процант росту прадукцыйнасьці працы эканоміць 150 тыс. руб. У саўгасы ўцягваюцца тысячы непадрыхтаваных кадраў, будаўніцтва пра водзіцца ня сталымі рабочымі кадрамі. У гэтых умовах прывядзеньне ў адпаведнасьць зарплаты з колькасьцю і якасьцю працы зьяўляецца неабходнай і абавязковай умовай выкананьня прамфінпляну. Непераход на зьдзельшчыну зьяўляецца буйнейшай безгаспадарчасьцю, зрывам гаспадарчага разьліку.

У правядзеньні зьдзельшчыны мы маем бязумоўныя посьпехі. У галіне паляводзтва большасьць саўгасаў перайшла на зьдзельшчыну (на 25 красавіка перайшло 73 саўгасы). Але ёсьць яшчэ і такія саўгасы, як **Зара Захаду, 1-га мая, Паўлаўка і Вайнілы**, якія выйшлі ў поле бяз зьдзельна-прыміяльнай аплаты працы, праявілі па сутнасьці сабатаж партыйных дырэктыў, праводзяць гэтым поўную безгаспадарчасьць. Не перайшлі на зьдзельшчыну ў галіне жывёлагадоўлі саўгасы: **1-га мая, Зара Захаду, Беларусь, Горкі-Абчаг, Антанопаль, Палелюм, Халопенічы, Пачаевічы, Васільеўск, Вусьце, Халоўе і Калініна.**

Рэкорд безадказных адносін да ўвядзеньня зьдзельшчыны ў галіне жывёлагадоўлі пабіў дырэктар саўгасу **Зара Захаду Яраш**, які з 15-га красавіка да 11 мая не зацьвердзіў пададзеных яму зоотэхнічных норм выпрацоўкі.

Саўгасы, якія не перайшлі на зьдзельшчыну, павінны зараз-жа заканчэньне пераход на зьдзельную і зьдзельна - прэміяльную аплату працы. Укараненьне зьдзельшчыны ва ўсіх работах, правільны вучот, правільная арганізацыя і растаноўка сіл (брыгады, групы), забясьпечэньне і ўшчыльненьне працоўнага дня, канчатковая ліквідацыя абязьлічкі, ёсьць абавязковая задача кожнага саўгасу. Бяз гэтага нельга сур'ёзна праводзіць выкананьне дагавораў з пераход на гаспадарчы разьлік.

Камсамол павінен выканаць дырэктыву ЦК КП(б)Б па мабілізацыі саўгасам Сьвінаводу 2.00 камсамольцаў. Дырэктары саўгасаў павінны наладзіць лепшую ўзаемадапамогу калгасам і забясьпечыць сябе ў поўнай меры патрэбнай, рабочай сілай.

У выкананьні гэтых асноўных рашаючых задач ляжыць посьпех гаспадарчага разьліку і выкананьня дырэктыў партыі па будаўніцтве фабрык мяса.

Аўчыньнікаў.

Саўгасы Белсельгастрэсту не перайшлі на гаспадарчы разьлік

Новая крэдытная рэформа пабудаваная на грунце гаспадарчага разьліку павінна забясьпечыць кантроль рублём па выкананьні гаспарадчых пляноў і ўзмацненьне гаспадарчай зацікаўленасьці кожнага прадпрыемства і кожнай гаспадарчай арганізацыі. З 1 мая гэтага году ўведзена новая практыка крэдытаваньня, да гэтага тэрміну павінны былі быць заключаны дагавары.

Аднак, ня гледзячы на дакладна вызначаны тэрмін пераходу на гаспадарчы разьлік, саўгасы Белсельгастрэсту ня справіліся з гэтай задачай. Ёсьць шмат саўгасаў, якія і зараз яшчэ не прыступілі да правядзеньня гэтага важнейшага гаспадарча-палітычнага мерапрыемства.

Кіраўнікі саўгасаў не ўявілі сабе ўсёй важнасьці пераходу саўгасаў на гаспадарчы разьлік. Між тым, спазьненьне з заключэньнем дагавораў і наогул нягнуткасьць у пераходзе саўгасаў на новую крэдытную сыстэму ўжо даюць свае вынікі. З прычыны незаключэньня дагавораў ня могуць быць адкрыты крэдыты саўгасам, а гэта выклікае перабой у іх гаспадарчай дзейнасьці.

Вакол пераходу саўгасаў на гаспадарчы разьлік ня была мабілізавана грамадзкая думка рабочых калектываў. З 90 саўгасаў Белсельгастрэсту, толькі 30 заключылі лёкальныя дагавары па рэалізацыі прадукцыі. Ёсьць і такія кіраўнікі—саўгасаў, **Рудабелка, Палажэвічы**,—якія ўсякімі мерамі адцягваюць заключэньне дагавораў на рэалізацыю малочнай прадукцыі, спасылаючыся на тое, што ня ведаюць колькі яе будзе ў гаспадарцы

Ня лепш абстаіць справа па некаторых саўгасаў ў выкананьні прамфінпляну і пастаноўцы вучоту гаспадарчых зваротаў. Саўгасы **Зуваравічы, Пракопаўка, Лютня-Бобрык і В.-Навасёлкі** ня выканалі прамфінпляну нават на 50 проц., Вельмі адстае бухгальтэрыя па саўгасах. У **В.-Навасёлках, Раванічах, Палажэвічах, Камаравічах, Крынках і Астраглядах** злачынна зрываецца справаздачнасьць як па выкананьні прамфінпляну, так і наогул па арганізацыі вучоту ў саўгасах.

Трэба рашуча пакончыць з нядбайнымі адносінамі да пераводу саўгасаў на гаспадарчы разьлік. У бліжэйшыя дні павінна быць закончана заключэньне дагавораў.

Сарагавец.

Ударнікі фабрыкі мяса-саўгасу „Будзёнавец" рапартуюць

Саўгас «Будзёнавец», Чэрвенскага раёну, да другой бальшавіцкай вясны арганізаваў 8 ударных брыгад з 58 ударнікаў, што складае 70 проц. усіх рабочых.

Мы высунулі сустрэчны плян: замест 616 штук сьвіней, здаць да канца году 641 штуку вагою замест [illegible] кілё,—у 110 і замест [illegible] пастанова [illegible] гаспадарак. Рамонт сельска-гаспадарчых інвэнтара закончаны па абодвых сэктарах. Аўчыстка насеньня праведзена ў калгасах на 100 проц., а ў аднаасобных гаспадарках на 80 проц.

Сельсавет павінен зараз-жа падцягнуць аднаасобны сэктар, выправіўшы слабыя вучасткі работы.

Мікола Яроменка.

Мы, ударнікі, далі абяцаньне [illegible] кім энтузіязмам будзем выконваць пастановы партыі і ўлады ў вырашэньні мясной праблемы. Прамфінплян 31 году мы выканаем з перавышэньнем.

Няхай жыве кампартыя, як кіраўнік перабудовы сельскае гаспадаркі на сацыялістычны лад!

Ударнікі па-бальшавіцку выконваюць сваю работу

У саўгасе Побалава, Рагачоўскага раёну, яшчэ ад 2-га мая пачалася веснавая сяўба. Рабочыя праводзяць сяўбу ўдарнымі тэмпамі, змагаючыся гэтым самым за будаўніцтва соцыялізму. Пад сталёвы ляскат трактара рабочыя абвясьцілі сябе ўдарнікамі-ленінцамі ў правядзеньні сяўбы на аснове разгортваньня сацспаборніцтва.

Рабочыя саўгасу - ўдарнікі абяцаюць па-бальшавіцку выконваць сваю работу.

Мажыеўскі.

„Што мне да аднаасобнага сэктару"

У Абчугскім сельсавеце, Чарэйскага раёну, аднаасобны сэктар марудна прыступае да сяўбы, яшчэ мала хто выяжджаў на поле араць. У выніку гэтага сяўба злачынна позьніцца.

Старшыня сельсавету тав. Грышанкоў ня прыняў ніякіх мер, каб аднаасобны сэктар сваячасова пачаў сяўбу. Замест практычнай работы тав. Грышанкоў спакойна адказвае:

— Што мне да аднаасобнага сэктару, ён мяне мала турбуе...

Трэба, каб адпаведныя арганізацыі прымусілі тав. Грышанкова пацікавіцца і аднаасобным сэктарам.

Зоркі.

Плян адгрузкі насеннай бульбы павінен быць выканан

Да адказнасьці зрыўшчыкаў!

13 МАЯ

За 11 мая—677,1 тон.
За 12 мая—258,6 тон,
За 13 мая—382,9 тон.



Белкаапсаюз адгрузіў 192,3 тоны насеннай бульбы і 166,6 тон сталовай, а разам—358,9 тон. Плян адгрузкі выкананы на 13,9 проц.

Насеннай бульбы адгружана на Украіну — 15,6 тон, для прыгарадных гаспадарак Масквы — 29,2 тон і ў Ленінградзкую вобласьць — 147,5 тон.

Беллёнасаюз адгрузіў толькі 24 тоны насеннай бульбы ў Ленінградзкую вобласьць, выканаўшы агульны плян адгрузкі на 27,6 проц.

Плян адгрузкі з БССР насеннай бульбы выканан толькі на 19,5 проц.

Насенная бульба павінна быць адгружана поўнасьцю.

Рашучы адпор шкодным разважаньням

Загатоўка і адгрузка бульбы пралетарскім цэнтрам па Лагойскім раёне праходзіць нездавальняюча. Замест плянавых 700 тон, адгружана толькі 50 тон, загатоўлена і гэтымі днямі будзе адгружана яшчэ 65 тон.

Кіраўнікі спажыўкаапэрацыі і каапсаюзу надумаліся, што бульбы ўжо больш няма ў сялян, значыць, трэба паслабіць, або зусім спыніць загатоўку і адгрузку бульбы.

Загатоўчым арганізацыям прапанавана мабілізаваць увесь свой апарат і актыў і ў шчыльным кантакце з сельсаветамі, парт'ячэйкамі, камсамолам і вясковым актывам узяцца за баявое выкананьне пляну загатоўкі і адгрузкі бульбы.

Я. Гольдберг.

Веткаўскі раён зрывае загатоўку бульбы

Веткаўскаму раёну дано заданьне загатовіць 1520 тон бульбы. З гэтага заданьня загатоўлена на сёньня толькі 350 тон.

Такі дрэнны ход загатоўкі бульбы тлумачыцца тым, што раённая партыйная арганізацыя начале з райкомам партыі стаіць ў баку ад загатоўкі бульбы. Старшыня праўленьня райспажыўсаюзу т. **Жалязьняк** не адзін раз узьнімаў пытаньне як у райкоме, так і ў райвыканкоме аб дапамозе для ўзмацненьня загатовак бульбы, але РВК пашоў насустрач толькі 6 мая, пасьля тэлеграмы старшыні СНК тав. Галадзеда, і толькі тыдзень назад райком партыі даў дырэктыву аб мабілізацыі некаторых раённых работнікаў для ліквідацыі прарыву па загатоўках бульбы.

Зараз 20 чалавек знаходзіцца на раёне. Да гэтага дня ўся работа па загатоўках была ўскладзена на райспажыўсаюз.

Веткаўскі сельсавет, злосна ня выконвае заданьняў па бульбазагатоўках. З заданьня ў 103 тоны ён выканаў толькі 6 тон. Гэты сельсавет знаходзіцца ў раённым цэнтры перад вачыма членаў партыі, якія сабатуюць дырэктывы і зрываюць загатоўкі. Старшыня гарсавету, т. **Рабой** на неаднаразовыя заўвагі т. **Жалезьняка** аб неабходнасьці прыняць меры для ўзмацненьня загатоўкі бульбы, адмахваецца рукою і спасылаецца на аб'ектыўныя труднасьці. Горш таго, старшыня сельспажыўтаварыства, т. **Сушанскі** ў момант прарыву пастараўся выехаць па іншых сельсаветах кажучы, што на месцы будуць праводзіць бульбазагатоўкі члены праўленьня сельспажыўтаварыства. Апошнія-ж заяўляюць аб нерэальнасьці нараду.

Ня лепш справа з загатоўкай бульбы па Старасельскім сельсавеце, які атрымаў нарад на 103 тоны, а выканаў толькі 13. Старшыня сельсавету т. **Бісякоў**, зусім нічога ня робіць, а жыве абяцаньнямі, што бульбазагатоўкі будуць выкананы. Сельсавет ня ведае, як выкананы цьвёрдыя заданьні, даныя кулацка-заможнай частцы вёскі. Вучоту ніякага няма, члены сельсавету бязьдзейнічаюць і часам ўтойваюць кулакоў ад цьвёрдых заданьняў.

Камсамол, на сёньняшні дзень таксама, стаіць у баку ад загатовак бульбы. Сакратар раённага камітэту камсамолу т. Рутэнбэрг, вылучаны ў Нова-Громыдзкі сельсавет па загатоўках бульбы, пастараўся выехаць, замест сельсавету, ў г. Гомель, дзе сядзіць і па сёньняшні дзень.

Нельга не адзначыць прарыву загатоўкі бульбы і па Бясенскім сельсавеце, якому дана заданьне 84 тоны, а выканана ўсяго толькі 33 тоны. Старшыня сельсавету, тав. **Рэдзькаў** аддае ўсе сілы для выкананьня пляну, але яму перашкаджаюць і не даюць магчымасьці выканаць нарад кулацкі настроены члены сельсавету.

Цьвёрдыя заданьні па сельсавеце даны 41 гаспадарцы ў колькасьці 26 тон, а як выкананы гэтыя заданьні ні сельскі савет, ні члены сельсавету ня ведаюць.

Замест выразнага правядзеньня клясавай лініі члены сельсавету зрываюць правадзімыя мерапрыемствы, ня выконваюць самаабавязацельстваў па здачы бульбы, ня прымушаюць кулакоў здаваць бульбу, не складаюць актаў на кулакоў і не перадаюць справы сьледчым органам. Інакш кажучы, члены сельсавету процідзейнічаюць правядзеньню мерапрыемстваў партыі, і ўраду сярод насельніцтва.

Сельспажыўтаварыствы бязьдзейнічаюць, аб гэтым ведае раённы камітэт партыі і РВК, але мер ніякіх ня прымаюць. Раённы пракурор тав. Арцюшэнка лавінен заняцца пытаньнем загатоўкі адгрузкі бульбы.

Плян загатоўкі павінен быць поўнасьцю выканан. Бязьдзейнасьці паасобных работнікаў адпаведныя органы павінны сказаць сваё важкае слова.

Аксенчык.

Пад суд загатоўца Новіка!

Дрэнна наладжана работа на Дзёрнаўскім загатоўчым пункце пры сельспажыўтаварыстве Нараўлянокага раёну. Загатоўца Новік заўсёды недзе гуляе. Калі беднякі і сераднякі прывозяць здаваць бульбу ,дык ім даводзіцца шукаць прыёмшчыка па ўсім сяле. Не знайшоўшы яго і прастаяўшы ля загатоўчага пункту ўвесь дзень, яны вярочаюцца з бульбай дамоў. Так было са здатчыкамі бульбы з Хаткаўскага сельсавету.

У дні паводкі перавезеная праз ваду і замочаная бульба ссыпалася разам з сухой добраякаснай бульбай. Ад гэтага ўся бульба пачынае псавацца, а распраджэньне адгружаць бульбу няма.

Райсаюз павінен зьвярнуць увагу на работу Дзёрнаўскага загатоўчага пункту, аздаравіць яе і неадкладна накіраваць бульбу па прызначэньні.

С. В.

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ
Стар. 2 № 108 (3196)

Вышэй тэмпы веснавой сяўбы

Бязьлітасна ўдарыць па апартуністах, якія недаацэньваюць важнасьці выкананьня плянаў веснавой сяўбы ў аднаасобным сэктары

Толькі правільна наладжаныя ўзаемаадносіны паміж калгасамі і аднаасобнікамі-беднатой і сераднякамі, і бальшавіцкая работа калгасаў на аснове зьдзельшчыны пры шырока разгорнутым сацспаборніцтве і ўдарніцтве, забясьпечаць магутны калгасны прыліў

Тэмпы сяўбы нездавальняючыя

Ва ўсіх раёнах БССР пачалася масавая сяўба. Некаторыя раёны і паасобныя калгасы і саўгасы паказалі ўдарныя тэмпы работы па правядзеньню бальшавіцкай вясны.

Аднак, агульны тэмп сяўбы па ўсіх сэктарах застаецца не здавальняючым. На 10-та мая плян сяўбы па БССР выканаў ледзь на 3,6 проц.; на гэты тэрмін было засеяна 95.445 га. Асабліва адстае аднаасобны сэктар, які выканаў 3 проц. заданьня. Таксама марудна разгортваецца сяўба і па сацыялістычным сэктары: калгасы выканалі 4,5 пр., саўгасы—5,3 проц.

Між тым 20-25-га мая павінны ў асноўным закончыць сяўбу паўднёвыя і сярэднія раёны БССР. На сёньняшні дзень гэтыя раёны павінны былі выканаць пляны сяўбы на 50 проц. Ня гледзячы на тое, што да вызначанага тэрміну засталіся лічаныя дні, што з прычыны позьняй вясны. трэба было ўшчыльніць тэрміны сяўбы,—паасобныя раёны да апошняга часу праяўляюць бязьдзейнасьць у гэтым пытаньні.

Бабруйскі, Брагінскі, і Глускі раёны зусім не вядуць вучоту сяўбы па аднаасобным сэктары; дрэнна ідзе сяўба і па калгасах гэтых раёнаў; у першым з іх калгасы выканалі 0,5 проц., у другім 0,6 проц. пляну. Недапушчальным зьяўляецца такое становішча, калі паўднёвыя раёны, дзе сяўба пачалася яшчэ каля 20-га красавіка, да гэтага часу вельмі мала засеялі. Напрыклад, аднаасобны сэктар Камарынскага раёну выканаў плян сяўбы толькі на 1,8 проц., Нараўлянскага — 3,8 проц., Пятрыкоўскага — 5,3 проц., Рэчыцкага —6,2 проц., Копыльскага—1,5 проц., Слуцкага — 4,1 проц.

Там дзе вакол веснавой кампаніі мабілізавана грамадзкая думка, дзе усе арганізацыі прымаюць актыўны ўдзел,—там сяўба праводзіцца больш шнаркімі тэмпамі.

Па Хойніцкім раёне—аднаасобны сэктар выканаў 17,8 проц. пляну, саўгасы—69 проц.

Тэмпы сяўбы, асабліва па аднаасобным сэктары, зусім нездавальняючыя, трэба рашуча пераключыць работу на ударныя рэйкі, трэба максімальна ушчыльніць тэрміны сяўбы. Перадавыя раёны павінны ўзяць на грамадзкі буксір найбольш адсталыя.

Сяўба яравых культур павінны быць скончана ў вызначаныя тэрміны.

Новы прыліў у калгасы Глушчыны

Посьпехі калгаснага руху дасягнутые пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, выклікаюць новы, яшчэ больш магутны, уздым калгаснага прыліву. За мінулы месяц па Глускім раёне ўступіла ў калгасы 369 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Паасобныя сельсаветы набліжаюцца да суцэльнай калектывізацыі: напрыклад у Латысокім сельсавеце калектывізавана 80 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. У Глускім сельсавеце —57 проц., у Парыцкім сельсавеце—42 проц. і г. д.

У часе першамайскіх сьвят у калгасы асабліва ўзмацніўся прыліў бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. У Парыцкім сельсавеце арганізавана тры новых калгасы: «Камсамольская Праўда» з 45 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, «Чырвоная Пліч» з—10 гаспадарак і «Чырвоны Сьцяг» з—10 гаспадарак.

У калгас «Камсамолец», Гарадзкога сельсавету ўступіла 1 бядняцкая гаспадарка і 3 адзіночкі. Створана цыятыўная трупа «Юны Ленінец» 7 гаспадарак.

У калгас «Камуніст» Гарадоцкага сельсавету, уступіла 4 бядняцка-серадняцкіх гаспадаркі, у калгас імя Будзёнага—8.

Веснавую сяўбу калгасы раёну [illegible] большаецці сустрэлі ўдарнае [illegible] вана і распачынаюць яе на аснове зьдзельшчыны.

Ал. Дымкоў.

РАСЬЦЕ ХВАЛЯ КАЛГАСНАГА ПРЫЛІВУ

Крычаў. (Наш. кор.). Бяднякі і сераднякі—аднаасобнікі Крычаўшчыны на першамайскі заклік раённага зьлёту калгасьнікаў адказваюць масавым уступленьнем у калгасы.

У дзень першага мая па ўсіх сельсаветах адбыліся масавыя дэманстрацыі, якія паказалі беднаце і сераднякам-аднаасобнікам новую магутную сілу вёскі—калгасы.

У Касьцюковіцкім сельсавеце ў часе дэманстрацыі 8 бяднякоў і сераднякоў-аднаасобнікаў падалі заявы аб прыёме іх у калгасы і тут-жа прыстроіліся да калёны ўдарнікаў калгасных палёў.

У в. Баеўка, Баеўскага сельсавету, арганізаваўся новы калгас з 12 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Гэты сельсавет зараз калектывізаван на 70 проц. г. зн. ён ужо набліжаецца да суцэльнай калектывізацыі і поўнай ліквідацыі кулацтва як клясы.

Асабліва вялікія прылівы адбыліся ў калгасы Паланіцкага сельсавету. У в. Паланіцы гэтага сельсавету арганізаван новы калгас «Чырвоны Май» з 22 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. У в. Раманаў-Кут таксама арганізаван калгас з 11 гаспадарак У калгасе «Чырвоны Прамень» улілося 14 гаспадарак. Па Сакольніцкаму сельсавету таксама наглядаецца калгасны прыліў. З усіх сельсаветаў паступаюць звесткі аб тым, што хваля калектывізацыі захапіла бяднату і серадняка кожнай вёскі і кожнага пасёлку.

Распрацоўваючы заклік раённага зьлёту калгасаў усе калгасы дадатковa ўзялі на сябе рад абавязацельстваў па правядзеньні веснавой сяўбы. У калгасах растуць калёны ўдарнікаў, высунуты сустрэчныя пляны па пасеву тэхнічных культур.

Калгас імя гаэты «Сацыялістычны Шлях» узяў на сябе абавязацельства, апрача складзенага пляну сяўбы, дадаткова пашырыць пасеўную плошчу на 50 га і засеяць лёну замест 20 га—30 га.

Гэты-ж калгас першы ў раёне арганізаваў пасеў 1 га у карысьць МОПР і выклікае пасьледваць гэтаму прыкладу ўсе калгасы БССР.

Актыўнасьць калгасьнікаў і іх [illegible] адзёрасьць з кожным днём узрастае. Усё гэта дае гарантыю таму, што пастанова бюро Крычаўскага РК КП(б) аб ахопе калгасамі 55 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак за час веснавой сяўбы будзе выканана з перавышэньнем.

Семянкоў.

Узяць на грамадзкі буксір

Аднаасобны сэктар **Сьмілаўшчыны** дрэнна падрыхтаваўся да веснавой сяўбы. Па Рудзенскім і **Замастоцкім** сельсаветах насеньне па аднаасобным сэктары ачышчана ў нязначнай колькасьці. Па **Замастоцкім** сельсавеце плян зернаачысткі выкананы на 19 проц. У в. Раўнапольле быў прывезены трыер, які хутка сапсаваўся. Раўнапольскі сельсавет нават не паклапаціўся аб тым, каб адрамантаваць трыер і пусьціць яго ў работу.

Раённыя арганізацыі і сельсаветы праявілі бязьдзейнасьць у галіне падрыхтоўкі аднаасобнага сэктару да веснавой сяўбы. Ня былі ўжыты належныя захады, каб выкарыстаць зернаачышчальныя машыны калгасаў, якія ўжо даўно скончылі зернаачыстку.

Вакол [illegible] зернаачысткі ня была мабілізавана грамадзкая думка, своячасова ня былі ўжыты меры, каб калгасы ўзялі на грамадзкі буксір аднаасобны сэктар.

СКСУ таксама праявілі поўную бязьдзейнасьць і ня прымаюць ніякага ўдзелу ў падрыхтоўцы да правядзеньня веснавой сяўбы. Дукорскі і Рудзенскі СКСУ засьмечаны і непрацаздольны. Часта сяляне прыяжджаюць у СКСУ за насеньнем, але ня могуць дабіцца толку, бо нельга застаць старшыню СКСУ ці намесьніка яго.

Трэба зараз-жа рашуча ўзяцца за арганізацыю дапамогі аднаасобнаму сэктару. РВК, сельсаветы і СКСУ павінны на ходу перабудаваць сваю работу па арганізацыі дапамогі аднаасобнаму сэктару.

Неабходна арганізаваць масавую дапамогу заўтрашнім калгасьнікам-яшчэ сёньняшнім аднаасобнікам з боку калгасаў.

Калгасы павінны ўзяць на грамадзкі буксір аднаасобны сэктар па правядзеньні другой бальшавіцкай вясны.

М. Піскун.

Абавязуемся скончыць сяўбу за 24 дні і выклікаем „будзёнаўцаў"

Мы, рабочыя саўгасу Раванічы, абвяшчаем сябе ўдарнікамі імя 518 і 1040 і абавязуемся быць імі да канца пяцігодкі. Мы бярэм на сябе абавязкі у час другой бальшавіцкай вясны ісьці ў першых радох за выкананьне і перавыкананьне пастаўленых задач у трэцім рашаючым годзе пяцігодкі. У час сваёй працы абавязваемся быць прыкладнымі ва ўсіх галінах працы: аўладаць тэхнікай, лепш адносіцца да сельска-гаспадарчага інвэнтару, эканоміць гаручае перавыкананць нормы выпрацоўкі па зьдзельшчыне, палепшыць якасьць работы, пашырыць пасеўную плошчу, і ўсёй сваёй прыкладнай работай уцягваць у рады сацспаборніцтва і ўдарніцтва ўсіх астатніх рабочых і калгасьнікаў.

Мы. абавязваемся веснавую пасеўную кампанію скончыць ударнымі тэмпамі за 24 дні.

Прымаючы заклік тульскіх рабочых, мы выклікаем на сацспаборніцтва саўгас «Будзёнавец».

Ударныя брыгады саўгасу Раванічы:

Аляшкевіч Сашка, Кузьняцоў, Стрыга, Пашковіч, Ксяневіч, Фалька, Редава Рася, Жакевіч Мар'я, Сушкевіч В., Малевіч А., Усьцін Адам, Анікевіч, Катусьцінскі, Белабровік Сьцяпан.

Варакса Антон, Кудзін П., Фалешчык С., Шатрун М.

Васько Дзяніс, Сушкевіч Дзям'ян, Кужаль, Пляшкевіч, Кавецкі, Пацына, Жывіцкі, Яблонскі, Бабіцкі, Гарошка Ф., Спарыш А.

Баршчэўская Т., Сахончык М., Бярозка Н., Сушкевіч Ева, Казачонак Ю., Войцік А., Ведабей А., Мурашка Я., Чарняк М., Багданава.

Фалейчык Язэп, Валодзька Казімір, Курневіч Сьцяпан, Казачонак Р., Сушкевіч К., Баршчэўская М., Дзяруга А., Сахончык А., Мурашка Язэп, Тарасевіч Я., Спарыш М., Яцкоўскі Стась, Гардзей Кастусь.

Раманоўскі С., Дырында С., Сасункевіч Л., Калтовіч, Пікулік.

Жывіцкая Г., Сушкевіч Язэп, Васько Стэфка, Градовіч Волька.

Прымаем выклік Заходняй і Ленінградзкай абласьцей

Уключаемся ва ўсесаюзную льняную пераклічку

Праблема тэхнічных культур і стварэньне магутнай сыравіннай базы для лёгкай індустрыі, якая павінна абслугоўваць патрэбы прамысловасьці, — зьяўляецца ў сучасны момант, побач з праблемай жывёлагадоўлі, фронтам асаблівай увагі і клопат партыі і ўсёй пралетарскай дзяржавы.

Пытаньне шырокага разьвіцьця лёнаводзтва, побач з разьвіцьцём іншых тэхнічных культур, упіраецца ў цэлы рад цяжкасьцяў. Асноўная прычына таму, што да гэтага часу лёнаводзтва не заняла яшчэ належнага месца трэба шукаць у тым, што да гэтага часу ў апрацоўцы лёну, у тэхніцы яго ўбор кі існавалі дапатопныя прыёмы і што асноўныя цяжкасьці былі яшчэ таму, што лён быў у руках дробна-таварнай індывідуальнай сялянскай гаспадаркі.

Падвядзеньне пад лёнаводчую гаспадарку тэхнічнай базы, бурныя тэмпы калектывізацыі, прынятая ўрадам і партыяй праграма па ажыцьцяўленьні індустрыялізацыі лёнаводзтва адкрывае шырокія пэрспэктывы разьвіцьця лёнаводзтва і ўядымае тэхніку лёнаводзтва на вышыню, якая цалкам адпавядае пастаўленым партыяй і ўрадам задачам.

У ажыцьцяўленьні гэтай баявой задачы рашаючую ролю адыгрывае разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва і мабілізацыя шматмільённых мас ільнаводаў, калгасьнікаў і аднаасобнікаў у барацьбе за лён.

Ня меншую ролю ў гэтым пытаньні адыгрывае друк, як вострая зброя бальшавіцкай самакрытыкі, як арганізатар мас рабочых, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў у барацьбе за выкананьне ільнянай праграмы.

Друк заходняй абласьці, газэты «Рабочий Путь», «Социалистическая деревня», «Большевитский Молодняк», «абласная радыё-газэта» і раённая газэта Вяземшчыны «Большевитский Путь» выклікалі Ленінградзкую абласьць на ільняную пераклічку.

Ленінградзкая абласьць прыняла выклік заходняй абласьці. Сабраўшыся ў Ленінградзе ў рэдакцыі «Ленинградской Правды» для распрацоўкі канкрэтнай праграмы дзеньня ў барацьбе за лён, прадстаўнікі газэт і калгаснікаапэрацыйнай сыстэмы абодвых абласьцей пастанавілі лічыць неабходным ператварыць гэтую пераклічку ва ўсесаюзную ільняную пераклічку ўсіх лёнаводных раёнаў Саюзу для таго, каб злучаным змаганьнямі друку і арганізацый лёнаводчых раёнаў, на аснове сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва з найбольшым посьпехам і найкарацейшым тэрмінам дабіцца вырашэньня праблемы лёну ў поўнай адпаведнасьці з пастановамі XVI зьезду партыі.

Абласныя газэты заходняй і Ленінградзкай абласьцей выклікалі абласныя газэты Масквы, Івана-Вазьнясенску, Беларусі, Ўралу, Нижнега Ноўгараду, заходняй Сібіры ўключыцца ва ўсесаюзную ільняную пераклічку.

У адозьве друку заходняй і Ленінградзкай абласьцей да ўсіх лёнаводных раёнаў выстаўляюцца канкрэтныя задачы гэтай пераклічкі. У адозьве мы чытаем:

«Уцягнуць у гэту пераклічку ўсе раённыя газэты ільнаводчых раёнаў, усю армію калгаскораў і селькораў, ільнасаўгасы і калгасы.

Арганізаваць грамадзкі буксір перадавых раёнаў, сельсаветаў, ільн

Зноў сыгналізуем

аб прарывах у выкананьні прамфінпляну на гомельскіх лесазаводах „Калектыўная Праца“ і „Сацыялізм“

Няўменьне кіраваць, прагулы, рвацтва, адсутнасьць сацспаборніцтва і ўдарніцтва, апартуністычная недаацэнка культмасавай работы,—вось галоўная прычына ганебных прарываў

Неадкладна перабудаваць работу адпаведна дырэктыў партыі

Ажыцьцявіць дырэктыву партыі

Давесьці культвыхаваўчую работу да цэхаў і брыгад

Лесазавод «Калпраца» асобы квартал скончыў з прарывам на 14 проц., апазнаўшы за сабой таксама запазычанасьць па зьніжэньні сабекошту на 10 проц. Аднак, ня гледзячы на абяцаньні рабочага калектыву зьвярнуць гэтую запазычанасьць у 1-м квартале 3-га рашаючага году пяцігодкі, мы маем далёка не бальшавіцкія паказьнікі выкананьня заданьняў. Калі завод мазівінен быў распілаваць 37624 кубамэтры, дык у першым квартале 1931 году ён распілаваў 31708 кубамэтраў, ці 83 проц. праграмы. Выпрацавана ліпрадукцыі 21.682 кубамэтры замест 26145 кубамэтраў, ці 82 проц.

У першыя 15 дзён другога кварталу завод, замест ліквідацыі прарыву, яшчэ больш паглыбіў яго, бо на 15-е красавіка вытворчая праграма выканана на 81 проц.

Лесазавод «Сацыялізм», ня гледзячы на тое, што заданьне за асобы квартал ім выканана з перавышэньнем на 7 проц., у першым квартале пачаў здаваць тэмпы. Замест таго, каб распілаваць 26344 кубамэтры, распілавана 23631 кубамэтр, ці 89 проц.

У першыя 15 дзён другога кварталу, лесазавод «Сацыялізм» заданьне выканаў ўсяго на 75 проц.

Да гэтага трэба дадаць, што замест зьніжэньня сабекошту на 13 проц., ён павялічаны на 24 проц.

Рашаючай прычынай недавыкананьня пляну першага кварталу зьяўляецца **недастатковая мабілізацыя** гаспадарчага прафэсыянальнага, камсамольскага, партыйнага і ўсяго беспартыйнага актыву, вакол тых канкрэтных заданьняў, якія стаяць перад калектывам. Гэта абавязвае ўсю партыйную арганізацыю, увесь рабочы калектыў у другім квартале мабілізаваць сілы ня толькі на выкананьне пляну, але на пакрыцьцё старой запазычанасьці краіне.

Для таго, каб ажыцьцявіць гэтую задачу, необходна прывесьці ў баявую гатоўнасьць, у першую чаргу, увесь партыйны калектыў. Асаблівая адказнасьць усклаваецца на камуністаў і камсамольцаў, працуючых на вытворчасьці, іх роля павінна быць даведзена да мяжы, якая забясьпечвае выкананьне бальшавіцкіх тэмпаў у рабоце.

ЦК партыі, у сваёй пастанове ад 21-га марта аб партыйнай і масавай рабоце ў цэху, даў катэгарычныя дырэктывы «дамагчыся ў самы кароткі тэрмін ажыцьцяўленьня дырэктыў XVI-га зьезду партыі аб пагалоўным уцягненьні камуністаў і камсамольцаў у сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва».

Партыйныя арганізацыі павінны без адкладна рэалізаваць гэтую дырэктыву ЦК. Ня можа быць камуніста рабочага на вытворчасьці па-за спаборніцтвам і ўдарніцтвам. Аднак, на лесазаводах ахоплена сацспаборніцтвам усяго 45 проц. Ёсьць цэлы рад момантаў, калі камуністы і камсамольцы, за вест таго, каб сваім асабістым прыкладам уцягваць беспартыйных ва ўдарную работу, самі зьяўляюцца ілжэўдарнікамі.

Вось яны, гэтыя ілжэўдарнікі

Тав. **Табухаў Г.,** член партыі, зьняты з работы ў калгасе за правядзеньне праваапартуністычнай работы. На заводзе ён таксама праводзіць апартуністычную практыку. Табухаў, працуючы ў Леспрамгасе брыгадзірам па лесазагатоўках, гультайнічаў, сядзеў дома, атрымліваючы за гэта камандыровачныя і сутачныя, ды да таго-ж забраў кажух і валенкі. Тав. Табухаў кажа, што «няма грошай, няма чаго есьці, ня можа працаваць на вытворчасьці, падаючы заяву за заявай аб вылучэньні.

Тав. **Бычкоў,** член партыі, на працягу цэлага году знаходзіцца на чорнай дошцы, аднак, ён не стараецца змыць з сябе гэтую ганебную пляму. Ён працягвае сыстэматычна позьніцца на работу, адносячыся да вытворчасьці абы як.

Ёсьць і такія камуністы, як **Астпейка і Сарокалетаў,** на якіх выдаткавана ня мала сродкаў для навучаньня іх распілоўшчыкамі. Яны скарджацца на парткалектыў, што ім абвешчана вымова за тое, што яны заявілі: «няхай коні працуюць на вашых заводах, а мы сабе знойдзем лепшае». Яны нарэшце пакінулі завод.

Тав. **Белякоў,** напрыклад, гаворыць так: «я ведаю 7 гадзін адпрацаваць на вытворчасьці, а вы—рашайце на вашых сходах што хочаце, з буду згодны».

Не адстаюць ад гэтых камуністаў і члены партыі **Ліхута, Быхоўскі, Кардаш,** якія зусім не жадаюць удзельнічаць у грамадзкім жыцьці заводу.

Ёсьць і такія моманты, калі камуністы займаюцца самазабясьпячэньнем. Напрыклад, дырэктар заводу «Сацыялізм» **Мацакоў** у адзін дзень атрымаў кажух, плашч, цёплыя майткі, боты, а пам. дырэктара тав. **Дудукалаў** напісаў рэзалюцыю сьпісаць гэта, як спэц вопратку. Бухгальтэрыя і абслугоўваючы пэрсанал заводу «Сацыялізм» атрымалі за тое, што яны... адстаюць у рабоце, скураныя курткі.

Ёсьць моманты, калі члены партыі ня выконваюць рашэньняў партыйнага калектыву. Калі 13 марта бюро парткалектыву вынесла рашэньне аб мабілізацыі ўсіх камуністаў і камсамольцаў, на ўборку берагоў, на ліквідацыю прарыву на складзе, гэта рашэньне ня толькі членамі ячэйкі, але і членамі бюро ня было рэалізавана. Партсходы наведваюць 40-50 проц. усіх камуністаў. Сярод камсамольцаў таксама не праводзіцца ніякай выхаваўчай работы. Тав. **Златкін Л.,** сакратар камсамольскага калектыву, зусім не мабілізуе апошні, ня гледзячы на тое, што сярод камсамольцаў ёсьць лятуны і ілжэўдарнікі:—**Равуцкі і Ліберaў.**

Адсутнічае выхаваўчая работа

Заўком, праўда, перабудаваў сваю работу. Ёсьць цэхавыя, зьменныя праф камітэты. Аднак, яны стаяць у баку ад вытворчасьці. Лесапільны цэх,—асобны цэх заводу, у якім маецца 3 зьменных прафкамітэты. Аднак, цэхавач партыйная ячэйка не мабілізавала ўвагі вакол выкананьня прамфінпляну, ня гледзячы на тое, што гэты цэх увесь час працуе з прарывам ад 10-15 проц. У гэтым цэху прагулы з кожным днём павялічваюцца. Ёсьць моманты нявыхаду на работу ў нядзелю і сьвяточныя дні. На гэтыя агідныя недапушчальныя зьявішчы ніхто не рэагуе.

Зусім адсутнічае палітыка-выхаваўчая работа сярод новых пластоў рабочых. Між тым, папаўненьне рабочых, галоўным чынам, ідзе за кошт сялянскага маладняка.

Ёсьць паасобныя вылазкі клясаварожых элемэнтаў—**Юшкевіч, Мельнікаў, Балмотаў.** Гэтыя выступленьні не сустракаюць належнага адпору.

Клюб заўсёды пустуе, у ім рабочы ня бачыць адбітку сваёй вытворчасьці, не знаходзіць у ім культурнага адпачынку.

Не змагаюцца з прагуламі

Вельмі мала ўвагі аддаецца перагляду норм расцэнак, ня гледзячы на тое, што насьценгазэты ўнесьлі цэлы рад дзельных прапаноў.

Вытворчыя камісіі працуюць дрэнна, не аддаючы ўваті ўсім пытаньням вытворчасьці. Мы маем агідныя і недапушчальныя адносіны да работы з боку адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу. Вось чаму, за першы квартал тэхнічныя перапынкі раўняюцца 1800 рама-гадзінам, ці 8 проц. да ўсяго адпрацаванага часу, за што больш 50 проц. віны прыпадае не заводакіраўніцтва.

Ня гледзячы на тое, што завод з 1-га мая стаў на рамонт, вытворчыя ка місіі не ўзялися, як сьлед, за абор рабочых прапаноў да рамонту

Пытаньне аб аўладаньні тэхнікай для лесазаводаў, як відаць, не існуе. Ніводная трамадзкая арганізацыя аб гэтым не загаварыла, ня гледзячы на цэлы рад дырэктыў партыі па гэтым пытаньні.

Заўком, суды і трыбуналы, зусім бязьдзейнічаюць па лініі барацьбы з прагуламі, якія дасягаюць нячуваных разьмераў. У студзені ня выйшла на работу па няўважлівых прычынах 72 рабочых і было 286 рабочых дзён прагулаў. У лютым прагулы складалі 587 рабочых дзён, а ў сакавіку 696 рабочых дзён. Калі прагулы за першы квартал 1930 году складалі 0,56 проц. да ўсяго адпрацаванага часу, дык за першы квартал 1931 году—3,58 проц. Агульная страта рабочага часу ла хавробе, камандыроўках, раўняецца 13 проц. Характарна, што трыбуналы за гэты час ня вынесьлі ніводнага свайго рашэньня, не ўдарылі па іх з бальшавіцкай настойлівасьцю.

Пытаньне аб дякучасьці рабсілы таксама нікога ня цікавіць, ня гледзячы на тое, што была стаянка заводаў на пранягу 300 гадзін. З гэтым злом ніхто не змагаецца.

Вялікія страты дае вытворчасьці і тое, што асноўныя крыўніжі ня бываюць на месцы. Ужо месяц, як няма старшыні заўкому. Хутка месяц, як няма сакратара партыйнага калектыву. Іх, праўда, замяшчаюць іншыя, але ім вельмі цяжка справіцца з усімі вучасткамі работы. Дырэктар лесазаводу, таксама не заўсёды бывае на заводзе.

Не рэагуюць на рабкораўскія нататкі

Насьценгазэты на заводах працуюць ня дрэнна. Замест адной газэты на заводах ёсьць 7 газэт. Аднак, ня гледзячы на тое, што маецца вялікі зрух у рабоце насьценных газэт, нельга не адзначыць, што яны яшчэ і на сёньняшні дзень недастаткова змагаюцца вакол тых асноўных задач, якія стаяць перад калектывам у справе выкананьня прамфінпляну. Яны недастаткова б'юць па тых ненармальнасьцях, па тых канкрэтных назьбітаў зла, якія перашкаджаюць выкананьню вытворчага заданьня.

Бюро парткалектыву, праўда, 13 красавіка паставіла пытаньне аб тых каму ністах, якія зусім ня хочуць працаваць у рэдкалегіі, даўшы ім адпаведныя партпагнаньні. Многа перашкаджае рабоце насьценгазэт і тое, што заўком і гаспадарнікі не рэагуюць на зьмешчаныя заметкі ў насьценгазэтах ці адгаварваюць фармальны адпіскай. Характарна, што калі тав. **Дворкіну** (заг. складам), была падана цэлая сэрыя заметак аб ненармальнасьцях на складзе, ён напісаў рэзалюцыю «правільна». Але што канкрэтна зроблена для ліквідацыі гэтых ненармальнасьцяй, аб гэтым ён замаўчаў.

Быхаўскі пагражае

Рабкораўскі актыў мабілізаваны зараз вакол пытаньня **норм і расцэнак.** Да 22 красавіка выпускаецца 5 нумароў газэт, з якіх 50 проц. матар'ялу будзе прысьвечана да надыходзячага рамонту заводаў. Аднак,—ёсьць моманты прымірэнчых адносін да разьвіцця самакрытыкі. Калі на бюро ячэйкі 5 красавіка разглядаўся матар'ял «Палескай Праўды», які выкрыў ка муніста Быхаўскага ў тым, што ён у часе работы піў, гультайнічаў, займаўся рвацтвам і калі гэтыя ўсе факты поўнасьцю падцьверджаны партыйны камісіяй, кантрольнай камісіяй і бюро ячэйкі, **Быхаўскі ў спрэчках заявіў, што ён зжыве таго, хто яго выкрыў ў друку. Нягледзячы на такое антыпартыйнае выступленьне тав. Быхаўскага ніхто ня даў яму адпаведнага адпору,** а наадварот падтрымлівае яго.

Выканаць рашэньні XVI партзьезду

Заводы маюць і дасягненьні. Яны перайшлі на 7 гадзінны рабочы дзень. Праграма па экспарту выкананa на 112 проц., заданьне па пазыцы выкана на 142 проц., аднак, іменна гэтыя дасягненьні патрабуюць хутчэйшай ліквідацыі прарыву.

Партыйныя арганізацыі заводу павінны ўзмацніць мабілізацыю партыйных мас на выкананьне рашэньняў XVI зьезду партыі і пастановы ЦК УсеКП(б) аб пагалоўным уцягненьні камуністаў і камсамольцаў у сацспаборніцтва.

Цэхавыя і партыйныя ячэйкі на заводах абавязаны не трацячы часу, пра верыць свае рады, вызваліўшыся ад баласту, які сваім «прыкладам» разьвальвае беспартыйны актыў. Кіруючую ролю камуністаў на вытворчасьці трэба ўзьняць. Рашэньні партыі павінны быць даведзены да кожнага камуніста і камсамольца.

Вытворчая праграма 2-га кварталу павінна быць выканана абавязкова. Заводы павінны зьвярнуць краіне запазычанасьць за першы квартал.

Е. Худыш.

Гомель. Нова-Беліца.

Да адказнасьці зрыўшчыкаў прамфінпляну

Амаль усе прадпрыемствы г. Воршы ўжо перайшлі на энэргію Першай БЕЛДРЭС (Асінбуду). Толькі завод **«Спартак»** ніяк ня можа атрымаць электра-энэргію БЕЛДРЭСу ня гледзячы на тое, што ў яго і рухавікі вельмі старыя і папсаваныя, патрабуючыя многа дроў і нафты, і ўсёроўна не забясьпечваючыя завод патрэбнай колькасьцю энэргіі. Гэтыя старыя рухавікі заводу кожны дзень зьнішчаюць ня менш дзесяці кубамэтраў і па некалькі пудоў нафты. Заводакіраўніцтва ўжо даўно вынесла пастанову перавесьці работу заводу на энэргію БЕЛДРЭСу. Аднак, па міласьці Аршанскага Гаркамбінату і ВЭО рашэньне заводакіраўніцтва застаецца вісець у паветры. Так завод і застаецца без электраэнэргіі са сваімі старымі рухавікамі.

Калі пракладвалі падземны кабель-провад для току БЕЛДРЭСу, дык як раз каля заводу «Спартак» здарыўся прарыў мэтраў на 30. Гэты прарыў не запоўнен. І вось Гаркамбінат і ВЭО не пакланаціліся запоўніць прарыў і даць ток заводу. А па прычыне адсутнасьці энэргіі, завод ня можа выконваць прамфінпляну, зьніжаць сабекошт прадукцыі і падвышаць вытворчасьць працы.

Ня ў меншай меры перашкаджае заводу выконваць прамфінплян і Аршанскае аддзяленьне Саюзхлеба, якое вельмі некаротна, з вялікімі затрымкамі дастаўляе заводу занаряджаны для яго авёс. Дзякуючы, гэтаму, крупадзёрны цэх заводу, які ў асобным квартале перавыканаў свой прамфінплян нядаўна з-за адсутнасьці аўсу-цэлы месяц вымушан быў прастаяць.

Заводу павінна быць аказана дапамога. Яму павінны даць ток БЭЛДРЭС і своячасова яго забясьпечваць сыравінай, а бюракраты з Горкамбінату і Саюзхлебу-зрыўшчыкі прамфінпляну павінны быць прыцягнуты да адказнасьці.

А. К.

Быць на чале барацьбы за гаспадарчы разьлік

Неадкладнае ўкараненьне гаспадарчага разьліку ў брыгады і групы—важнейшая задача кожнай партыйнай ячэйкі

Давесьці гаспадарчы разьлік ня толькі да цэху, але і да брыгады

Да пераводу ўсіх цэхоў заводу «Бальшавік» на гаспадарчы разьлік, на гэтым заводзе ужо было праведзена перабудова партыйнай, прафэсыйнай і ўсёй масавай работы. Уся работа была перанесена ў цэх, ў брыгаду. Перавод цэхоў на гаспадарчы разьлік зьявіўся завершэньнем гэтай перабудовы.

Парткалектыў заводу да пераходу на гаспадарчы разьлік падышоў з усёй сур'ёзнасьцю, вакол гэтага пытаньня была разгорнута шырокая масавая работа.

Пасьля ўсебаковага абгаварэньня гэтага пытаньня на Бюро парткалектыва і на заўкоме, яно было перанесена на шырокае абгаварэньне рабочых у цэхох, у брыгады. Парт'ячэйкі разгарнулі шырокую работу, мабілізавалі ўвагу ўсіх рабочых навакол абгаварэньне дагавароў. Сходы ў цэхах праходзілі пры актыўнейшым удзеле і вялікай зацікаўленасьці рабочых.

18-га сакавіка былі падпісаны ўмовы паміж асобнымі цэхамі заводу. Цэхі пачалі работать на аснове гаспадарчага разьліку. Цэхавай адміністрацыі прадстаўлены шырокія адміністрацыйныя правы. Цяпер адміністрацыя цэху, парт'ячэйка, цэхавы камітэт нясуць поўную адказнасьць за ўсю работу цэху, яны адказваюць за выкананьне прамфінпляну, за якасьць прадукцыі і г. д.

Праверкі выкананьня заключаных дагавароў паміж цэхамі яшчэ не рабілася. Але і без праверкі можна зрабіць вывад — перавод на гаспадарчы разьлік ужо даў свае станоўчыя вынікі. Зьвернемся да фактаў.

Красавік месяц «Бальшавік» скончыў са значным прарывам. Прамфінплян быў недавыкананы на 12 проц. па колькасных і на 6 проц. па якасных паказальніках. Вынікам пераходу на гаспадарчы разьлік зьяўляецца тое, што да 12-га мая завод выканаў майскае заданьне 1-шых двух пяцідзёнак і пакрыў недавыкананьне за красавік м-ц. Па думцы старшыні заўкома майскі плян будзе поўнасьцю выканан не пазьней 20-га мая. На заводзе значна павялічыўся прыток рацыяналізатарскіх прапаноў, значна паменшыўся працэнт прагулаў, узьнімаецца новая хваля вытворчага энтузіязму рабочых, пашыраецца роля ўдарнікаў,—вось, кароценькія папярэднія вынікі гаспадарчага разьліку на заводзе «Бальшавік».

Л. Н—скіі.

Гаспадарчым разьлікам па безгаспадарчасьці і нядбайнасьці

Выходзячы з дырэктывы Бюро Гаркому аб перагляде норм расцэнак, парткалектыў імя Ланцуцкага (Гомель) пачаў абгаварэньне гэтага пытаньня на партыйных сходах, на цэхавых ячэйках. Асабліва востра высоўваецца необходнасьць перагляду норм па тых цэхах, дзе маюцца яўна памылковыя нормы, як напрыклад: мэханічны цэх, дзе маецца нагрузка варштату толькі на 26 проц.; вагонны цэх, у сувязі з разьбіўкай работы на вузкую спэцыяльнасьць, таксама патрабуе перагляду норм. Зараз яшчэ канкрэтных вынікаў няма. Работа па перагляду норм будзе працягнута яшчэ некалькі тыдняў. Гэта неабходна для таго, каб даць матчымасьць цэхам усебакова абгаварыць гэтае пытаньне з увзглядам яго прапрацоўкі з задачамі выкананьня прамфінпляну і хутчэйшага ўвядзеньня гаспадарчага разьліку.

У апошніх лічбах сакавіка, парткалектыў заводу абмеркаваў вынікі першага кварталу і прамфінплян другога кварталу. Першы квартал не давыкананы на 20 проц. Адставаў калёшны цэх, які даў 54 проц. выкананьня. На сёньняшні дзень не ліквідаван прарыў па ліцьцю. Кіраўніцтва заводу ня здолела пераключыць работу ў цэхох на ўдарныя тэмпы, ня здолела, як сьлед, расставіць рабочую сілу, ня здолела мабілізаваць усе ўнутраныя рэсурсы заводу ў барацьбе за прамфінплян.

Перагляд норм расцэнак адначасова высоўвае пытаньне аб пераводзе цэхаў на гаспадарчы разьлік. Зараз наглядаецца столькі вялікіх выдаткаў, якія ня маюць непасрэднага дачыненьня да таго ці іншага цэху. Бываюць і такія выпадкі, калі адзін цэх бярэ ў другога вуглі, жалеза і гэта заносіць на свой рахунак. Такой неразьберысе ў цахох трэба накласьці канец. З першага мая электрастанцыя, ліцейны цэх і кавальны цэх ужо пераведзены на гаспадарчы разьлік. У працягу другога кварталу павінен перайсьці на гаспадарчы разьлік увесь завод.

Зараз цэхі ўжо цікавіць тое, колькі будзе каштаваць ліцьцё, колькі каштуе кілёграм пакоўкі. Раней гэта, хоць і абгаварвалася, але-ж ня так горача і ня так канкрэтна, а зараз выдаткаваньне матар'ялаў, выдатак рабочага часу і ўсе выдаткі на выработак адзінкі павялічваецца рублём і з гэтым патрэбна лічыцца.

Па адміністрацыйна-тэхнічных выдатках, па правам — адміністрацыі перавыдатку няма. Пакуль што, кажа адміністрацыя, з-за недахвату людзей па цэлым радзе цэхаў мы абыходзімся з малай колькасьцю людзей адміністрацыйна-тэхнічнага складу.

Праграма ў гэтым годзе ў сумарных адносінах надта павялічана У мінулым годзе завод імя Ланцуцкага меў заданьне па прамфінпляну на 4 мільёны руб., а зараз — на 10 мільёнаў. Пры наяўнасьці гэтага абсталяваньня і рабочай сілы маюцца ўсе магчымасьці да выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну.

Тарыфна-нарміровачнае бюро зараз праводзіць падрыхтоўчую работу па загрузцы рабочага часу, перагляду норм, парадку чаргі. Партыйны камітэт ставіў гэта пытаньне на пасяджэньні бюро і на сходах партыйных ячэек. Вакол пытаньня на пасяджэньні бюро і на сходах партыйных ячэек. Вакол пытаньня пераходу на гаспадарчы разьлік патрэбна мабілізаваць увагу ўсёй рабочай масы, арыентуючы яе на выкананьне ўзятых абавязкаў, скарыстоўваючы энтузіязм мас у барацьбе супроць непаладак, безгаспадарнасьці, бясплянавасьці, якія існуюць у цэхах.

Гаспадарчы разьлік павінен ажывіць работу цахоў, вядзіцца барацьбітом па выкананьні гаспадарчых плянаў — сацбудаўніцтва. Парткамітэт павінен у гэтай барацьбе быць на чале.

Я. Ісароў.

Няма гібкасьці і рашучасьці

Пераход цэхаў заводу імя Варашылава на гаспадарчы разьлік абгаварваўся на бюро парткалектыву, на сходзе партарганізацыі, і на нарадзе адміністрацыйна-гаспадарчых работнікаў заводу. Былі праведзены гутаркі ў цэхах і зьменах з рабочымі аб значэньні гаспадарчага разьліку і яго практычным ажыцьцяўленьні.

Цэхі заводу пераведзены на гаспадарчы разьлік з красавіка г. г.

На сёньняшні дзень яшчэ ёсьць асобныя работнікі, якія не зразумелі сутнасьці гаспадарчага разьліку, і часта разладжваюць нармальныя ўзаемадносіны паміж цэхамі.

Калі зьвяртаецца адзін начальнік цэха да другога за дапамогай, дык атрымлівае часта адказ такога зьместу: «ты, браток, ня лезь да мяне, бо ў мяне, дзяржразьлік». Зьвяртаецца майстра сьлясарна-зборачнага цэху т. Федасеяў да заг. матар'яльна-гаспадарчай часткі заводу т. Плоткіна за атрыманьнем фурманкі для тэрміновых патрэб цэху, апошні адказвае: «няхай начальнік цэху натіша і падпіша паперку, тады дам фурманку».

Пераход асобных брыгад і груп на гаспадарчы разьлік праходзіць марудна. І яшчэ ў красавіку м-цы камуна імя «518», якая стаіць на зборцы сьвідравальных варштатаў, пастанавіла перайсьці на гаспадарчы разьлік. Камуна напісала аб гэтым адкрыты ліст начальніку цэха і зьвярнулася да ўсіх рабочых і работніц з заклікам перавесьці ўсе брыгады на гаспадарчы разьлік.

Заклік камуны ня быў падтрыманы адміністрацыяй і астатняй часткай рабочага калектыву, камуна і да гэтага часу не змагла дабіцца ажыцьцяўленьня сваёй пастановы.

Зараз рыхтуюцца да пераходу на гаспадарчы разьлік брыгады па зборцы тормашын, экстрактараў і цэнтравальных варштатаў, дзьве брыгады кацельнага цэху. Амаль нічога яшчэ ня зроблена на пераводу на гаспадарчы разьлік груп такарнага цэху, якія і да гэтага часу выдаткоўваюць безгаспадарча омазачны, сьцірачны матар'ял і электраэнэргію.

Трохкутнік цэхаў і груптокараў яшчэ як належыць не ўзяўся за правядзеньне гэтага важнейшага палітычна-гаспадарчага мерапрыемства на справе.

Д.

Выправіць памылкі на ходу

Гаспадарчы разьлік — магутны рухавік вытворчасьці. Гэты магутны рухавік павінен быць напружан да адказу. Ужо шмат прадпрыемстваў, якія перайшлі на гаспадарчы разьлік, атрымалі станоўчыя вынікі.

Як-жа пераходзяць на гаспадарчы разьлік фабрыкі і заводы Магілеўшчыны?

Пачнем з хлебазаводу. Хлебазавод фармальна перайшоў на гаспадарчы разьлік, а фактычна права мае такі малюнак: адміністрацыя заводу пытаньня аб пераходзе на гаспадарчы разьлік не паставіла на абгаварэньне ўсяго рабочага калектыву, а вырашала яго канцлярскім і бюракратычным мэтадам. Рабочыя ня ведаюць зусім пра нормы выпрацовак па дагавору і наогул пра сутнасьць гаспадарчага разьліку. Гэтай апартуністычнай недаацэнцы актыўнасьці рабочых мас у справе вырашэньня найвастрэйшых палітычных гаспадарчых праблем ні партячэйка ні заўком не далі рашучага адпору.

Ня лепш справа абстаіць з пераходам на гаспадарчы разьлік на заводзе «Адраджэньне». Завод ідзе наперадзе прадпрыемстваў Магілеўшчыны па выкананьні прамфінпляну. Але-ж гэта не дае права заводакіраўніцтву адцягваць перавод заводу цэхаў на гаспадарчы разьлік. З 1-га мая ўсе цэхі заводу павінны быць пераведзены на гаспадарчы разьлік. Гэта ня зроблена і цэхі працягваюць работаць па старому. Парткалектыў заводу ня стаў на чале ініцыятывы мас у барацьбе за гаспадарчы разьлік.

На гаспадарчы разьлік павінны быць неадкладна пераведзены усе заводы і фабрыкі Магілеўшчыны. Тэрміны ўсе прайшлі. Марудзіць з гэтай справай нельга.

«К. М.»

„Лесазбыт“, адкажы

Нам трэба ў гэтым годзе даць будаўніцтву 123 мільёны сырца, з іх гатовай абажжонай цэглы 83 мільёна 750 тысяч. Гэту колькасьць будуць вырабляць нашы заводы па ўсёй Беларусі... Але, каб выканаць гэтую вытворчую праграму неабходна даць заводам усе магчымасьці, трэба даць заводам пабудаваць тыя вытворчыя і дапаможныя будынкі, якія адыгрываюць галоўную ролю ва ўсёй рабоце па вырабу цэглы.

Зараз стаіць востра пытаньне аб **піламатар'ялах.**

Коснасьць, спакой ў арганізацыях, якія павінны даць піламатар'ял ставіць пад пагрозу выкананьне прамфінпляну ў гэтым годзе.

***

Па каштарысах, па зацьверджаных данных, нам неабходна атрымаць на ўвесь год 8730 кубамэтраў піламатар'ялаў, а толькі па нарадах нам адпушчана на 750 кубамэтраў. Па нарадах—гэта яшчэ ня сам лес. А лесу на заводах няма.

Гэту колькасьць лесу неабходна заводам на ўвесь год, але з тае прычыны, што заводы ўсё лета працуюць па вырабу будаматар'ялаў, усю колькасьць трэба даць заводам неадкладна.

Заводы павінны зрабіць сушыльнае, сьцелажнае абсталяваньне, заводы павінны прыстасаваць замест жалезных вузкакалейных рэек — драўляныя на што патрэбны дошкі і рэйкі; заводы павінны зрабіць рамкі для сушкі цэглы і яшчэ шмат работ... А дошак няма, рэек няма, навіт нарадаў няма, а гэта таму, што **заводам ня выдзеляны фонды на лес.**

Нельга так зрываць прамфінплян мільёнаў штук цэглы для нашай прамысловасьці.

Ад правільнага і поўнага выкананьня прамфінпляну на гэтых заводах залежыць шмат прамфінпляну ў будаўніцтву ў розных галінах нашае вытворчасьці.

Брыгадзір газэты «Сав. Вел.»

Р. Кацнэльсон.

Кожны ўдарнік цэха—ударнік у агародзе

Без рабочай дапамогі прыгарадныя гаспадаркі ня выканаюць пляну сяўбы. Выканаем дагаворы паміж прадпрыемствамі і прыгараднымі гаспадаркамі—забясьпечым іх рабочай сілай

Прыгарадныя гаспадаркі чакаюць дапамогі

БАБРУЙСК, 7-V. (Наш кар.). Становішча палявых работ на прыгараднай гаспадарцы Цэрабкопу вымушае біць трывогу. Гаспадарка мае вялізарны недахват рабочае сілы. Дагаворы, якія заключылі прадпрыемствы і установы з Цэрабкопам па аказаньню дапамогі рабочай сілай самым ганебным чынам ня выконваюцца.

Такія буйныя рабочыя калектывы Бабруйска як трупком будаўнікоў, які павінен быў даць прыгарадныя гаспадарцы Цэрабкопу на працягу красавіка месяца звыш 500 чалавека-дзён, даў усяго толькі 70.

Заводу імя Сталіна патрэбна было даць 187 чалавек, паслана за красавік месяц усяго толькі 17 чалавек. На фабрыцы «Чырвоны Харчавік» замест 170 паслана толькі 90.

Ніводнае прадпрыемства Бабруйску ня выканала свайго дагавору. А такія трупкомы як трупком міліцыі, саюз мэдсанпрацы, швэйная фабрыка, нават ня далі ніводнага рабочага для працы на прыгарадныя гаспадарцы.

Такое становішча сьведчыць аб тым, што прафсаюзныя арганізацыі гораду Бабруйску не паставілі працу па дапамозе прыгараднай гаспадарцы у асародак сваёй увагі, не зрупавалі на гэтым прамадзкую думку рабочых прадпрыемстваў і працоўных гораду. Райпрафсавет зусім не кіруе правядзеньнем гэтай працы, не рэагуе на паўнейшае ігнараваньне праўных дагавароў.

Недахват рабочае сілы на прыгараднай гаспадарцы Цэрабкопу цягне за сабою зрыў плянаў веснавое сяўбы, а разам з гэтым і зрыў плянаў рабочага забесьпячэньня. Гэтага дапусьціць ні у якім разе нельга. Пакуль яшчэ ня позна патрэбна паставіць працу па дапамозе прыгараднай гаспадарцы у належныя рэйкі.

Прафарганізацыі павінны узяць на сябе поўную адказнасьць за выкананьне дагавароў.

Алонскі.

Аршанскі ЦРК спаткаў сяўбу непадрыхтаваным

ВОРША (наш. кар.). Падрыхтоўка да сяўбы ў прыгарадных гаспадарках АЦРК праходзіла ўвесь час марудна.

У выніку гэтага АЦРК спаткаў вясну непадрыхтаваным. Плян па закладцы парнікоў—ня выканан. Ям было падрыхтавана на 2.400 рам, а фактычна закладзена толькі 2082 рамы.

Недавывезена шмат гною і вашы. Не хапае шмат насеньня. Амаль зусім нехапае кармовых траў і ў значнай частцы—кораньплодаў. Адсутнасьць патрэбнага насеньня траў і кораньплодаў стварае пагрозу арганізацыі кармовай базы ў ЦРК. Між тым, кармовая база—вельмі важна для ЦРК, які ў гэтым годзе ўсю зіму амаль быў без кармоў і карыстаўся толькі завозам.

Таксама нехапае і значнай колькасьці гароднага насеньня: бульбы раньняй маецца ўсяго 76,8 тон (з 96 тон патрэбнай), гуркоў—246 кілёграм (з 270 патрэбных), цыбулі—704 кілё, радзіскі—15 кілё, фасолі—325 кілё (з 384 патрэбных).

Адсутнасьць гэтага насеньня пагражае выкананьню гароднай праграмы па прыгарадных гаспадарках ЦРК. Трэба сказаць, што стараецца пагроза недасеву па прыгарадных гаспадарках.

З цяжкага становішча, у сувязі з недахватам рабочай і цягавай сілы, ЦРК выйдзе. Тут яму рабочай сілай дапамогуць прафсаюзы, а атрыманыя 2 трактары замяняць недастачых коняй. Аднак, і справа з арганізацыяй дапамогі з боку прафсаюзаў рабочай сілай яшчэ не наладжана.

ЦРК павінен заключыць з прафсаюзнымі арганізацыямі прадпрыемстваў умовы, па якіх ён атрымае ад прафсаюзаў рабсілу і, ў роваю чаргу, дасьць, гэтым прадпрыемствам гародніну.

Частка прафарганізацый прадпрыемстваў г. Воршы, як, напрыклад Хлебазаводу, Лесазаводу, Чыгунна-ліцейнага і рэм-мэханічнага заводу, Вінзаводу, і саюзу Мэдсанпрацы, умовы з ЦРК ужо заключылі. Другая частка, як—Сталярныя майстэрні, Лынокамбінат, Групком будаўнікоў і Сілікатны завод гэтага яшчэ не зрабілі. ЦРК чакае. А на справе крыху ня так павінна быць.

Для ЦРК патрэбна рабсіла і ён павінен сам пайсьці да прафсаюзных арганізацый, не чакаючы іх да сябе, і там з імі заключыць умову, каб аб ёй ведалі і рабочыя.

Аднак, ня гледзячы на рад недахопаў у падрыхтоўцы да сяўбы, усё-ж такі сяўба па прыгарадных гаспадарках ЦРК пачалася ўжо і праходзіць пасьпяхова. Узорана пад гароды ужо 36 га, з якіх і засеяна 1,5 га гароднымі культурамі: сталовымі буракамі—0,75 га і сталовай морквай—0,75 га. Канюшыны па жыце пасеяна 38 га. Прабаранавана ральлі 51 га.

Для таго, каб сяўба ішла больш пасьпяхова і каб ліквідаваць пагрозу недасеву, АЦРК патрэбна неадкладна прыняць самыя тэрміновыя меры ў справе завозу і загатовак недастачога насеньня як гародніны так і кармовых і вернявых культур.

А. Кудрын.

Даць насеньне Петрыкаўскай прыгараднай гаспадарцы

Гор. Петрыкаў. (наш кар.). У сьнежані месяцы 1930 г. у г. Петрыкаве арганізавана прыгарадная гаспадарка, якая на сёньняшні дзень мае малочнай жывёлы—104 шт., коняй—29 шт. і 126 га пахатнай зямлі, якая павінна быць засеяна ў гэтым годзе.

Зямля выдзелена вельмі добрая і знаходзіцца ўсяго ў 3-х кілёмэтрах ад горацу.

Гной ужо вывезены, а інвэнтар і цягавая сіла знаходзіцца ў баявой гатоўнасьці.

Але, ня гледзячы на дасягненьне ў сэнсе падрыхтоўкі да сяўбы, маецца пагроза зрыву сяўбы.

Калі маецца дастатковая колькасьць гароднага насеньня, дык у насеньні вікі, канюшыны і аўса адчуваецца востры недахват. Гэтага насеньня амаль няма.

Улічваючы наяўнасьць жывёлы ў гаспадарцы, заставіць плошчу незасеянай плошчы паказанымі культурамі—будзе вялікім злачынствам.

Загадчык гаспадаркі ня раз ставіў пытаньне перад райсаюзам, як непасрэдным гаспадаром гаспадаркі, аб набыцьці насеньня, але апошні як-бы наўмысьля да гэтага часу нічога не зрабіў.

Ставілася пытаньне таксама і перад РВК і перад райкомам партыі, але і яны нічога не зрабілі, не зварочваюць увагі.

У гаспадарцы раней налічвалася 21 чалавек рабочых. Яны павінны былі атрымаць паёк, згодна існуючай пастановы, як рабочыя саўгасу.

Што-ж атрымалася? Райсаюз катэгарычна адмовіўся ад выдачы па закону паложанага, у выніку чаго рабочых у гаспэдарцы засталося толькі 7 чалавек. як'я ні ў якім выпадку ня здолеюць апрацаваць і засеяць 126 га пахаці. Неабходна трымаць пад увагу што гаспадарка мае ў сваім карыстаньні і шмат свіней.

Аб недахваце насеньня старшыня, акрамя ўсяго, заяўляў непасрэдна ў БКС, але апошні пал

Пастанова Камісіі Выкананьня пры СНК БССР

пра выкананьне дырэктыў аб вясновай пасеўнай кампаніі ў прыгарадных гаспадарках спажывецкай каапэрацыі

Выслухаўшы даклад прадстаўнікоў Белкаапсаюзу т. Сулькінай, Віцебскага ЦРК т. Фальковіча, Менскага ЦРК т. Кумкеса і садаклад прадстаўніка НК РСІ т. Каршакевіча аб падрыхтаванасьці прыгарадных гаспадарак спажывецкай каапэрацыі да вясновай пасеўнай кампаніі, Камісія Выкананьня пры СНК БССР прызнае, што прыгарадныя гаспадаркі яшчэ нездавальняюча падрыхтаваліся да вясновай пасеўнай кампаніі і лічыць устаноўленым ,што дырэктывы (студзеньскага Пленуму ЦК КП(б)Б і пастановы Эканамічнай Нарады БССР за 8 лютага 1931 г. «пра падрыхтоўку да вясновай пасеўнай кампаніі прыгарадных гаспадарак спажывецкай каапэрацыі» (З. З. БССР 1931 г., № 4, паст. 57) і Камісіі Выкананьня пры СНК БССР за 1 сакавіка 1931 г. пра выкананьне дырэктыў ЦК КП(б)Б і СНК БССР пра падрыхтоўку да правядзеньня вясновай пасеўнай кампаніі» (З. З. БССР 1931 г., адд. II, № 6, паст. 82) Белкаапсаюзам, ЦРК, чыгуначнымі спажывецкімі таварыствамі і гарадзкімі саветамі ў значнай часьці выкананы, што характарызуецца наступным:

а) прыгарадныя гаспадаркі няпоўнасьцю забясьпечаны зямлёю, у некаторых мясцох ім адводзілася неўдобная зямля, а таксама не ва ўсіх прыгарадных гаспадарках праведзена землеўпарадкаваньне;

б) прыгарадныя гаспадаркі зусім недастаткова ўкамплектаваны сталаю (72 проц. патрэбнай колькасьці) і асабліва сэзоннаю. (17 проц. патрэбнай колькасьці) рабочаю сілаю, а таксама наглядаецца цякучасьць рабочай сілы;

в) прагарадныя гаспадаркі няпоўнасьцю забясьпечаны цягавай сілаю (у сярэднім па ўсіх гаспадарках на 80 проц.);

г) недастаткова выкананы пляны вывазкі і завозу ўгнаеньня на гароды і палі прыгарадных гаспадарак;

д) у надзвычайна пагражаючым становішчы знаходзіцца забясьпечаньне прыгарадных гаспадарак насеньнем раньняй і позьняй бульбы, а таксама аўсу, вікі канюшыны;

е) нездавальняюча выкананы пляны закладкі парнікоў па колькасьці парнікоў, а таксама і па тэрмінах закладкі іх;

ж) слаба разгортваецца работа па перавоцу на зьдзельшчыну і ліквідацыі абязьлічкі і зусім нездавальняюча вядзе Белкаапсаюз і большая частка ЦРК і чыгуначныя спажывецкія таварыствы і прыгарадныя гаспадаркі работу па арганізацыі працы ў прыгарадных гаспадарках;

з) у Белкаапсаюзе і ва ўсіх ЦРК і чыгунача-спажывецкіх таварыствах няма прамфінпляну па прыгарадным гаспадаркам;

і) зусім недастаткова прыцягваецца да працоўнай дапамогі прыгарадным гаспадаркам рабочая прамаздзкасьць прамысловых прадпрыемстваў, якія шэфствуюць і прымацаваны да прыгарадных гаспадарак, асабліва недастаткова скарыстоўваюцца выхадныя дні рабочых і сем'яў рабочых на працы па пасадачна-пасеўнай кампаніі;

к) нездавальняюча праводзіцца арганізацыя гародаў самадзейнасьці і выяўленьня зямельных вучасткаў для іх;

л) Белкаапсаюз нездавальняюча кіруе і наглядае за ходам падрыхтоўкі да пасадачна-пасеўнай кампаніі ў прыгародных гаспадарках (недастаткова праводзіцца жывы інструктаж, безадказнае складаньне вестак і інш.), а таксама зусім слаба працуюць выдучаныя пяцёркі пры гарадзкіх саветах па кантролю і дапамозе прыгарадным гаспадаркам.;

Адзначаючы памянёнае вышэй Камісія Выкананьня пры СНК БССР—пастанаўляе:

1. Прапанаваць Белкаапсаюзу і ўсім ЦРК у максымальнай меры скарыстаць зямельныя ўжыткі (пералогі, выганы, нізкаўраджайныя сухадолы, лядо і г. д.) для засеву. Даручыць Народнаму Камісарыяту Земляробства і гарадзкім саветам, не пазьней як праз 5 дзён пераглядзець зямельныя фонды гарадзкой і прыгарадной мяжы і землі, якія не скарыстоўваюцца прырэзаць, прыгарадным гаспадаркам

Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Земляробства і гарадзкім саветам, у выкананьне пастановы СНК СССР ад 17 красавіка 1931 г. («Известия ВЦИК» № 107) правесьці да 1 кастрычніка 1931 г. зямельна-гаспадарчае ўпарадкаваньне ўсіх зямель, якія знаходзяцца ў гарадзкой мяжы і навакол гарадоў у радыусе 10 кілёмэтраў, выявіўшы фонды для арганізацыі і пашырэньня прыгародных гаспадарак.

2. Прапанаваць Белкаапсаюзу і Народнаму Камісарыяту Працы ўжыць тэрміновыя захады для вярбоўкі рабочай сілы, забясьпечыўшы на працягу аднэй дэкады ўкамплектаваньне прыгарадных гаспадарак патрэбнаю для сельскагаспадарчых работ рабочаю сілаю. Даручыць Белкаапсаюзу ў гэты самы тэрмін укамплектаваць прыгарадныя гаспадаркі кадрамі адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу ў пасобку па гародніцтву, парнікаводзтву і рахункаводэтву. Прапанаваць гарадзкім саветам і ЦРК у 3-х дзённы тэрмін выявіць у гарадох і на акраінах вольныя памяшканьні і прыстасаваць іх пад часовыя кватэры для рабочых прыгарадных гаспадарак, а Белкаапсаюзу і будаўнічым арганізацыям, якія праводзяць гэтую працу, закончыць будаўніцтва баракаў у прыгарадных гаспадарках да 1-га чэрвеня 1931 г.

3. Прапанаваць Белкаапсаюзу на працягу аднэй дэкады выкананць поўнасьцю плян закупкі коней. Даручыць Упаўнаважанаму Трактарацэнтру тав. Камаеву забясьпечыць, у адпаведнасьці з пастановай Эканамічнай Нарады ад 28 красавіка 1931 г. (газэта «Савецкая Беларусь» № 99) прыгарадныя гаспадаркі на 20 дзён не менш як 55 трактарамі.

4. Прапанаваць Белкаапсаюзу і ўсім ЦРК забясьпечыць поўнае выкананьне пляну вывазкі гною, попелу і іншага ўгнаеньня, а Белкаапсаюзу тэрмінова распрацаваць мерапрыемствы для скарыстаньня каналізацыйных нячыстот і палеў фільтрацыі, для ўгнаеньня гародаў прыгарадных гаспадарак.

5. Прапанаваць Белкаапсаюзу і Белсадгароднінне ў дэкадны тэрмін забясьпечыць прыгарадныя гаспадаркі насеньнем бульбы, недапушчаючы скарачэньня плану засеву бульбы, а Белкаапсаюзу і Народнаму Камісарыяту Земляробства ў 5-ці дзённы тэрмін праверыць фактычнае забясьпечаньне прыгарадных гаспадарак гародным насеньнем і выяўленыя лішкі перадаць для скарыстаньня іншым сыстэмам. Па пярэдзіць кіраўнікоў гаспадарчых устаноў, што за некарыстаньня насеньня вінаватыя асобы будуць прыцягнуты да судовай адказнасьці.

6. Прыняць да ведама заяву тав. Сулькінай, што на 1-е мая 1931 г. плян закладкі парнікоў у прыгарадных гаспадарках выкананн на 80 проц., (па пляну заданьню 50.000, выкананa 40.000).

7. Прапанаваць Белкаапсаюзу на працягу дэкады зрабіць у больш буйных ЦРК суцэльную праверку арганізацыі працы ў прыгарадных гаспадарках і перавоцу працы на зьдзельшчыну, камандыраваўшы на месцы для беспасрэднай дапамогі сваіх работнікаў. Не пазьней 15 мая скончыць складаньне рабочых плянаў па ўсіх прыгарадных гаспадарках і шырока абмеркаваць іх на сходах рабочых, ударных брыгадах і вытворчых нарадах.

8. Абавязаць Белкаапсаюз, ЦРК і чыгуначныя спажывецкія таварыствы не пазьней 15 мая 1931 г. скласьці прамфінпляны і забясьпечыць прыгарадныя гаспадаркі грашмі для пасеўнай кампаніі, а Белкаапсаюзу, ЦРК і гарадзкім саветам узмацніць працу па мабілізацыі сродкаў, выканаўшы поўнасьцю вызначаныя пастановаю СНК плян збору ўродкаў у другім квартале ў 2.000.000 руб.

9. Прапанаваць Белкаапсаюзу і ўсім ЦРК не пазьней 15 мая 1931 г. скончыць працу па заключэньню дагавароў і прымацаваньне гаспадарак да прамысловых прадпрыемстваў, ужыўшы захады да поўнага і неадкладнага скарыстаньня пастаноў сходаў рабочых аб практычным удзеле рабочых і членаў іх сем'яў у пасеўнай кампаніі.

10. Прапанаваць Белкаапсаюзу, гарадзкім саветам і прыгарадным сельскім саветам, на працягу 5-ці дзён, выявіць усе зямельныя вучасткі, якія можна скарыстаць для арганізацыі гарадзкіх гародаў, прыцягваючы для арганізацыі апошніх прафарганізацыі, ЖАКТ'ы, школы, вайсковыя арганізацыі і інш.

11. Даручыць Белкапсаюзу і ўсім ЦРК скончыць да 20-га мая ўсю падрыхтоўчую работу па паліўцы гародаў, арганізаваўшы адпаведныя вадаправодныя і вадазьмяшчальныя прыстасаваньні, а Белкапсаюзу і Акцыйнаму Таварыству па барацьбе са шкодні камі своячасова падрыхтаваць і правесьці працу па барацьбе са шкодні камі на прыгарадных гаспадарках.

12. Прапанаваць Белкаапсаюзу ўзмацніць жывое кіраваньне і дапамогу гаспадаркам ЦРК, чыгуначных спажывецкіх таварыстваў, зачыненых рабочых каапэратываў, раённых спажывецкіх таварыстваў і гародам самадзейнасьці і наладзіць справу падліку і кантролю за ходам пасеўнай кампаніі, абавязаўшы ўсе ЦРК у вызначаныя тэрміны даваць весткі аб ходзе пасеўнай кампаніі. Даручыць гарадзкім саветам узяць пад сыстэматычны і пільны нагляд работу прыгарадных гаспадарак, асабліва ход вясновай сяўбы і ўзмацніць работу вылучаных пяцёрак.

13. Усклясьці пэрсанальную адказнасьць за пасьпяховае правядзеньне вясновай пасеўнай кампаніі і выкананьне паказаных вышэй дырэктыў па лініі Белкаапсаюзу на тт. Хаскіна і Сулькіну, па лініі ЦРК на старшыень кіраўніцтва ЦРК і загадчыкаў сельскагаспадарчымі сэктарамі і па гарадзкіх саветах — на старшынь гарадзкіх саветаў і загадчыкаў зямельных аддзелаў.

Нам. старшыні камісіі выкананьня пры СНК БССР А. Калнін.
Сакратар камісіі выкананьня пры СНК БССР Я. Элькін.

10 мая 1931 г.
г. Менск.

Пастанова Камісіі Выкананьня пры СНК БССР

пра выкананьне дырэктыў пра пераход на спаранную язду на чыгунцы

Выслухаўшы даклады прадстаўнікоў Дырэкцыі МББ чыгункі тав. Саланецкага і Гомельскага Эксплёатацыйнага раёну тав. Салаўя і садаклад прадстаўніка НК РСІ т. Ярыгіна аб выкананьні адозвы СНК СССР і ЦК УсеКП(б) за 15 студзеня 1931 г. «Пачыгуначны транспарт» (З. З. СССР 1931 г. № 7, арт. 81) і пастановы СНК СССР за 25 лютага 1931 г. «Пра ўвядзеньне спаранае язды на ўсіх чыгунках» (З. З. СССР 1931 г. № 13, арт. 131), Камісія Выкананьня пры СНК БССР устанаўляе, што яшчэ поўнасьцю не ажыцьцёўлен пераход на спаранную язду на чыгунках БССР.

У Гомельскім эксплёатацыйным раёне ёсьць зрыў прымацованых да таварных паравозаў брыгад да 15 проц., у Жлобінскім раёне зрыў прымацаваных да таварных паравозаў брыгад дасягае 76 проц., а па пасажырскіх і манэўровых паравозных яшчэ існуе абязьлічка.

Зрыў спаранай язды наглядаецц так сама ў Аршанскім і Віцебскім эксплёатацыйных раёнах МББ чыгункі. Там, дзе добра пастаўлена і праводзіцца спараная язда, яна ўжо дала значныя станоўчыя вынікі, якія былі-б яшчэ большымі, каб ня было прарыву ў пераводзе на спаранную язду.

Камісія Выкананьня пры СНК БССР адзначае супрацўленьне ажыцьцяўленьню дырэктыў партыі і ўраду аб пераходзе на спаранную язду Начальніка Дэпо ст. Жлобін т. Сарокіна, у выніку чаго яшчэ не ліквідавана абязьлічка на пасажырскіх і манэўровых паравозах і фактычна зрываецца спараная язда на таварных паравозах, а так сама скрытае супрацўленьне па дэпо Віцебск. Выходзячы з вышэйпаказанага Камісія Выкананьня пры СНК БССР пастанаўляе:

1. Прапанаваць Упаўнаважанаму Народнага Камісарыяту Шляхоў пры СНК БССР, Дырэкцыі МББ і Заходняй чыгунцы забясьпечыць поўны і неадкладны пераход на спаранную язду, ліквідаваўшы маючыяся прарывы.

2. Прапанаваць начальнікам Гомельскага, Жлобінскага, Аршанскага і Віцебскага эксплёатацыйных раёнаў у пяцідзённы тэрмін прымацаваць да ўсіх пасажырскіх, таварных і манэўровых паравозаў паравозныя брыгады.

3. Даручыць Намесьніку Упаўнаважанага Народнага Камісарыяту Шляхаў пры СНК БССР т. Эгле на працягу дэкады ўзмацніць спэцыялістамі кіраўніцтва дэпо Жлобін, Асіпавічы, Магілеў і службу цягі Віцебскага вузла.

4. Давесьці да ведама Народнага Камісара Шляхоў Саюзу ССР аб тым, што ня гледзячы на двухразовае паведамленьне, Дырэкцыя Заходніх чыгунак, на якой маюцца найбольшыя прарывы па фактычнаму пераходу на спаранную язду, не прыслала свайго прадстаўніка ў Камісію Выкананьня пры СНК БССР, а даручыла зрабіць справаздачу па Заходняй чыгунцы Гомельскаму эксплёатацыйнаму раёну.

5. Абавязаць кіраўніцтва Заходняй чыгункі неадкладна зьняць з працы Начальніка Дэпо Жлобін т. Сарокіна за супрацўленьне ажыцьцяўленьню дырэктыў партыі і ўраду аб пераводзе на спаранную язду і назначыць начальнікам дэпо Жлобін такога таварыша, які-б палкам забясьпечыў выкананьне памянёнай дырэктывы .

6. Прызнаючы, што існуючая сыстэма вучоту паліва, калі вынікі вядомы праз два-тры месяцы, не выклікае зацікаўленасьці ў эканоміі паліва з боку паравозных брыгад, паставіць пытаньне перад Камісіяй Выкананьня пры СНК СССР і Народным Камісарыятам Шляхоў СССР аб зьмяненьні гэтага вучоту ў напрамку перанясеньня яго ў эксплёатацыйныя раёны і дырэкцыі чыгунак.

Нам. Старшыні Камісіі Выкананьня пры СНК БССР А. Калнін.
Сакратар Камісіі Выкананьня пры СНК БССР Я. Элькін.
10 мая 1931 г. г. Менск.

Добрая работа

Сьмілавіцкім райкомам саюзу сельгаспрацоўнікоў даны заданьні ў галіне мабілізацыі сродкаў па саўгасах. Саўгасу Завер'е дана заданьне ўцягнуць новых укладчыкаў і ўкладаў у ашчадкасы на суму 2.500 рублёў.

Абгаварыўшы заданьне, рабочыя прапанавалі ўцягнуць у ашчадкасы, акрамя рабочых, астатніе насельніцтва і сабраць сярод іх ня менш 3.000 рублёў. Узятае заданьне рабочыя ўжо заканчваюць выкананьнем. Мабілізацыя сродкаў працягваецца.

М. Піскун.

ШАХМАТЫ І ШАШКІ

№ 5 (220)

Пад рэдакцыяй **А. Касьперскага**

Задача № 5 Н. Ракітніка—Горкі



Бел. Кр c7, Ф e7, С g7, g8, К d6, g5 пп, d2, e2 (8).

Чорн. Кр d4, Л a3, С g3, С g6, Кf 6, Кg4, пп: 7, c5 (8).

Мат у 2 хады.

Усесаюзны шахматны чампіянат ВСФК.

У гэтым годзе чампіянат праводзіцца па групам. Па БССР і Заходняй вобласьці будзе праведзен турнір у Менску ў другой палове ліпеня. Але перад фінальным турнірам па БССР праводзяцца тры першачарговыя турніры: у Менску, Віцебску і Гомелі. У Менскі турнір дапушчаны: 1) Розэнталь, 2) А. Касьперскі, 3) Шукевіч, 4) Мазэль І, 5) Гавві, 6) Ю. Мэйэль, 7) Кейлес, 8) Верасаў, 9) Камянецкі, 10) Дупер, 11) Іваноў, 12) Насьцюшонак і 13) прадстаўнік ад МІЦВ (Менская Школа Вучнёўства). Пачатак ігры намечан на 20 мая.

Па Віцебску: 4 ад Віцебску, 2 ад Полацку, 1—Воршы і 1—Барысаву.

Па Гомелю: 3 ад Гомелю, 2 ад Магілеву, 1—Бабруйску, 1—Мазыру.

Пераможцы гэтых турніраў 4 ад Менску і па 2 ад Віцебску і Гомелю дапушчаюцца ў фінал.

Партыя іграна ў Стакгольме ў матчы.

Бел. Флор (Чэха-Славакія).

Чорн. Штольц (Швэцыя).

1 d2-d4, d7-d5, 2 c2-c4, c7-c6, 3 Кb1-d2, Кg8-f6, 4 Кg1-f3, Кb8-d7, 5 g2-g3, g7-g6, 6 Сf1-g2, Сf8 g7, 7 0-0, 0-0, 8 b2-b3, c6-c5, 9 С c1-b2, Л f8-e8, 10 c4-d5, К f6:d5, 11 К f3-e5, К d7:e5, 12 d4:e5, С c8-e6, 13 К d2-e4, Ф d8-c7, 14 Л a1-c1, b7-b6, 15 К e4:c5, b6:c5, 16 С g2:d5, Л a8 d8 17 e2-e4, С e6-h3, 18 Л f1-e1, e7,e6' 19 Ф d1-f3, e6:d5, 20 g3-g4, С g7:e5' 21 С b2:e5, Л e8:e5, 22 Ф f3:h3, d5:e4' 23 Л e1-e3, Ф c7-e7, 24 Л c1-e1, Л d8-d2 25 Л e3-e2, Л d2:e2, 26 Л e1:e2, Ф e7-e6' 27 Ф h3-g3, h7-h5, 28 f2-f4, Л e5-d5, 29 f4-f5, Ф e6 e5, 30 Ф g3:e5, Л d5:e5, 31 f5:g6, f7:g6 нічыя. Хоць і бяз выйгкаў, але жывая цікавая партыя.

На дапамогу пацярпеўшым ад землятрасеньня ў Закаўкаскай і Нахічаваньскай рэспубліцы

Уносім І выклікаем

Супрацоўнікі ЦВК усе, як адзін адгукнуліся на пастанову Бюро ячэйкі «Чырвонага Крыжу» аб дапамозе пацярпеўшым ад землятрасеньня і добраахвотна ўнесьлі ў фонд дапамогі 132 руб. 75 кап.

Калектыў ЦВК выклікае пасьледаваць яго прыкладу калектыў СНК.

***

Калектыў супрацоўнікоў СНК БССР правёў па падпісным лісьце збор сродкаў на дапамогу пацярпеўшым ад землятрасеньня. Ужо сабрана 215 рублёў. Калектыў СНК БССР выклікае пасьледаваць іх прыкладу калектывы: ДПУ, НК Гандлю, Белкаапсаюз, Дзяржплян БССР, НК Фінансаў і Дзяржбанк.

***

Канфэрэнцыя асьветнікаў Смалявіцкага раёну пастанавіла адлічыць 1 проц. месячнага заработку ў фонд дапамогі пацярпеўшым ад землятрасеньня.

Адначасова выклікаем асьветнікаў Самахвалаўскага раёну.

Асьветнік.

АПАВЯШЧЭНЬНІ

ПЭДГАБІНЭТ

15 мая г. г. у 19 гадзін—сход выкладчыкаў беларускай мовы і літаратуры ў Пэдгабінэце.

Разгляд праграм па мове і літаратуры для сямігадовых школ. (Дакладчык Бэндэ).

Падручнік—у сувязі з новай праграмай.

ЦЫРК-КІНО-ТЭАТР

Дзяржцырк	Сёньня і штодзённа **ВЯЛІКІ ЦЫРКАВЫ ПАКАЗ** Пачат. а 8 з пал. гадз. увечары
„Чырвоная Зорка“	Новы фільм сэзону, ЭКСПОНАТ З ПАНОКТЫКУМУ. Звыш праграмы Кіно-хроніка Саюзкіно № 20. Пач. а 7, 8 45, 10 30 г. Каса адч. з 5 гадз.
Кіно-тэатр „Культура“	Новы фільм **Джым Швантэ.** Звыш праграмы камэдыя РОМЭО І ДЖУЛЬЕТА. Пачат. а 7, 8 45 г., 10 30 г. Каса адч. з 5 г.
Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“	**Сарачынскі кірмаш** камэд. у 6 част. па аповт. Гогаля Пачат а 6 г. Каса адч. з 4 гадз. 30 хвіл.
Кіно „ПРАЛЕТАРЫ“	Нямецкі фільм **Прабуджэньне жанчыны** Драма ў 6 част. Пачатак а 7 гадз.
Кіно „Юны Піянэр“	эпізод грамадзянскай вайны **Бухта сьмерці** драма ў 7 частк. Пачат. сэансу а 1 г. дню. Каса адч. з 11 г.

Праўленьне Беларускага Таварыства драматычных пісьменьнікаў і кампазытараў

паведамляе, што камісія па праверцы складу членаў Т-ва **ВЫКЛЮЧЫЛА** са складу Т-ва наступныя асобы:

а) Грыневіча Антона, як асобу, якая ня мае дачыненьня да творчае працы Т-ва; б) Алексеенко-Дамаршчыкава Алексея, Амельянава Міколу, Варвака Алексея, Вярбіцкага Кастуся, Глінскую Аўдоцьцю, Глэздоўскага Александра, Гутароўскага Міколу, Гарэліка Наума, Гарбэр Раісу, Копельмана Іосіфа, Смацкага Максіма, Стэфанэско Жана, як асоб, вынадкова трапіўшых у склад членаў Таварыства; в) Дабравольскага, Залатарова, Міхеева, Мініцкага, Паддубнага, Самковіча і Юдзіна, як асоб, якія трапілі ў члены Т-ва выпадкова і ня маюць ніякай нават фармальнай сувязі з Т-вам; г) Дрэйзіна Юлія, як ідэолёгічна чужога і да гэтага часу не парваўшага з мінулым і ня прызнаўшага сваіх памылак, што асабліва яскрава выявілася ў яго выступленьні на пленуме ЦС працмастацтва (зборы „беспартыйных“ творчасьці).

Увага: Усе членскія білеты, выданныя праўленьнем Беларускага Таварыства дрампісьменьнікаў і кампазытараў за кругляю пячаткай, абвяшчаюцца несапраўднымі. Усім членам Т-ва прапануецца атрымаць новыя.

Праўленьне Т-ва.

Адміністрацыйна-гаспадарчаму кіраўніцтву Унівэрсытэцкага Гарадка патрэбны

НАСТУПНЫЯ ПРАЦАЎНІКІ:

а) інжынэр-будаўнік, б) бухгальтары, в) рахункаводы, г) сэкратар юрыст-консульт.

ПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ.

Перагаворы па гэтаму пытаньню штодзённа ад 9 да 16 гадз. дню, галоўны корпус Унівэрсытэцкага Гарадка, 2-гі паверх, пакой 2-33.

Праректар Кудзякоў.

Прывітаньне першаму Усебеларускаму зьлёту дзяткораў--

ударнікам трэцяга пакаленьня на фронце сацыялістычнага наступленьня

Дзяткоры ў барацьбе за генэральную лінію партыі

«Піонэр Беларусі» — газэта піонэраў і школьнікаў БССР — выходзіць менш 2-х год. Аднак, ня гледзячы на свой «дзіцячы ўзрост», газэта пад кіраўніцтвам партыі і комсамолу правяла вялікую працу па арганізацыі працоўнай дзетвары на актыўны ўдзел у соцыялістычным будаўніцтве.

ЦБ ДКО ЦК ЛКСМБ адзначыла вялікую ролю «Піонэра-Беларусі», ў ліквідацыі політычнага прарыву, які меўся ў піонэр-арганізацыі Беларусі, адзначыла, што газэта своячасова сыгналізавала аб гэтых прарывах.

Дзейнасьць «Піонэра» ўвесь час праходзіла пры актыўным удзеле тварцоў газэты — армії дзяткораў, якая расьце з кожным днём. Яшчэ ў мінулым годзе яе налізвалася некалькі сот чалавек. Ударных дзяткоравскіх брыгад зусім ня было. У сучасны-ж момант вакол газэты маецца досыць моцны актыў — звыш 60 ўдарных дзяткор-брыгад і 1000 дзяткораў. Праз гэту армію актыўных піонэраў і вучняў газэта мобілізуе працоўную дзетвару на выкананьне рашэньняў партыі і комсамолу.

Піонэр-арганізацыя заключыла дагавор з Наркамаземам і Белколгасцэнтрам на актыўны ўдзел у правядзеньні колектывізацыі і сельгаскампаніі. Адразу-ж арганізуюцца дзяткор-пасты у колгасах, саўгасах і вёсках для папулярызацыі сярод піонэраў і вучняў дагавору і яго рэалізацыі. Яны арганізуюць брыгады па ачыстцы насеньня, збору попелу, па праверцы падрыхтаванасьці машын і пасеўных плянаў да сяўбы. Пад кіраўніцтвам комсамольцаў, яны праводзяць гутаркі, чыткі сярод аднаасобнікаў аб перавагах колектыўных гаспадарак.

На вытворчасьці таксама арганізуюцца дзяткор-пасты. Яны клічаць піонэраў на актыўны ўдзел у выкананьні прамфінпляну на збор рабочых прапаноў, на барацьбу з прагульшчыкамі, за добрую якасьць выпускаемай прадукцыі.

— Наша дзяткор-брыгада была першым дапаможнікам РБ ДКО ў правяраці, — паведамляе старшыня Бабруйскага РБ ДКО.

Політэхнізацыя — важнейшая справа. Дзяткоры Гомелю, Менску, Барысаву, Віцебску, Магілеву адправіліся ў рэйд па праверцы становішча політэхнізацыі. Яны выкрылі шмат ненармальнасьцей. Дзяткоры з Магілеву сыгналізуюць, што дырэктар мэблёвай фабрыкі ня пушчае вучняў на завод. Партыйная і комсамольская арганізацыі рашуча ўдарылі па тых, хто зрывае політэхнізацыю і дзьверы фабрыкі былі шырока адчынены для вучняў.

Але ня ўсім спадабаецца гэткая дзейнасьць дзяткораў.

У Хоцімску клясавыя ворагі выключаюць са школы арганізатара дзяткор-брыгады Маісеенка за тое, што ён... дзяткор, за тое, што ён выкрыў у школе кулацкую групоўку. У Лютаўскай школе (Чарэя) кулак зьбіває актыўнага дзяткора Філонава і прапануе яму, з пагрозаю каб ён больш ня пісаў у газэту.

У адказ на наскокі клясавага ворага Маісеенка арганізаваў яшчэ 8 дзяткор-пастоў у колгасах Хоцімскага раёну. Філонаў яшчэ больш актыўна працуе і распаўсюджвае сярод сялян і дзяцей дарослых і дзіцячыя газэты. Клясаваму ворагу ня ўдасца спыніць магутнага дзяткораўскага руху.

Зьлёт дзяткораў, які адбудзецца сёньня падагуліць праробленую дзяткораў, вызначыць месца дзяткоў выкананьні задач пяцігодкі, шляхі стасаваньні форм і мэтадаў дзяткорскага руху да выкананьня задач, перад імі стаяць у 3-м рашаючым дзе пяцігодкі.

20-га мая пачынаецца месячнік дзяткораў. Зьлёт дзяткораў павінен даць легатам зарадку, каб на мясцох прынялі актыўны ўдзел ў правядзеньні месячніку і гэтым самым у падрыхтоўцы да Усебеларускага зьезду рабселькораў.

Пад кіраўніцтвам комсамольскіх арганізацый, піонэр-атрадаў і РБ ДКО, пры актыўнай дапамозе рэдакцый раённых газэт і армії рабселькораў дабіцца яшчэ большага разгортваньня дзяткоўскага руху і выкананьня лёзунгу:

Кожны дзяткор — ударнік, кожны ударнік — дзяткор!

М. Р.

Ударны выпуск Бел. Дзярж. Мэдінстытуту

Рашэньне XVI Партканфэрэнцыі аб новых бальшавіцкіх тэмпах сац. будаўніцтва — сацспаборніцтва і ўдарніцтва, падмацаваны далейшымі рашэньнямі XVI Партзьезду і лістападаўскім і Пленумам ЦК УсеКП(б) далі магутны ўздым актыўнасьці пралетарыяту СССР у будаўніцтве сацыялістычнае гаспадаркі і культуры. Навучальныя установы СССР, як кузьня пралетарскіх кадраў уключыліся у гэтыя бальшавіцкія тэмпы. 1 Бел. Дзярж. Мэдінстыту стаў на гэты шлях.

Выпуск маладых дактароў, якія сёньня перадае БДМІ для ўзмацненьня фронта аховы здароў'я працоўных, з поўным правам можа быць названы гістарычным. Каля 8-мі месяцаў таму студэнты 4-га курсу ў адказ на інфармацыю дырэктара інстытуту аб недахопе дактароў у абслугоўваньні сацыялістычнага сэктару вёскі пастанавілі выдзяліць ударную брыгаду каб не пагаршаючы, я наадварот — палепшыўшы якасьць вучобы — скончыць мэдінстытут на некалькі месяцаў раней тэрміну.

Ва ўдарную брыгаду запісаўся амаль, што ўвесь курс і ня гледзячы на некаторыя цяжкасьці і перашкоды стыдэнты, дзякуючы свайму пралетарскаму энтузіазму, пры маральнай і дзейственай дапамозе партыйных прафсыпткых і грамадзкіх арганізацый інстытуту, здолелі выканаць сяго сустрэчны акадэмічны плян у тэрміны, які яны сабе вызначалі.

Усе выкладчыкі адзначаюць, што ніколі яшчэ студэнты не працавалі такой напружанасьцю і пасьпяховасьцю як працаваў ударны курс у часы датэрміновага скончэньня праграмы.

Выпуск паказаў, што могуць даць бальшавіцкія тэмпы сацыялістычнае мэтадаў работы: сацспаборніцтва і ўдарніцтва, самакрытыка, насьцежка зэта, грамадзкі буксір і т. д. Ён таксама давёў скэптыкам і апартуністам, што паскораныя тэмпы, пры актыўнасьці і рацыяналізацыі выкананьня не вядуць да пагаршэньня якасьці, а наадварот — падымаюць вучобу на яшчэ большую вышыню.

Няхай жыве ўдарны выпуск Мэдынстытута Інстытуту, пралетарскія будаўнікі сацыялізму!

М. Кроль.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ

АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА

Менскага гарадзкога савету РС і ЧД

10 мая 1931 г. г. МЕНСК

Пра зацьверджаньне правіл супроць пажарнай аховы

Менскі Гарадзкі Савет рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў **пастанаўляе:**

1. Правілы пра супроцьпажарную ахову ў горадзе і сельскай мясцовасьці гарадзкой мяжы зацьвердзіць у ніжэй зьмешчанай рэдакцыі.

2. Вінаватыя ў парушэньні зацьверджаных гэтай пастановай правіл супроцьпажарнай аховы прыцягваюцца да адказнасьці ў адміністрацыйным парадку—штрафу да 100 руб., або прымусовых работ да 15 дзён.

3. Нагляд за выкананьнем ніжэй зьмешчаных правіл ускладаецца на міліцыю, сельскія саветы і кіраўніцтва пажарнай аховы г. Менску.

4. Гэтая абавязковая пастанова набывае моц праз 7 дзён з часу апублікаваньня.

Старшыня Гарсавету Валодзька.
Сакратар Гарсавету Шалкавец.

Правілы супроцьпажарнай аховы

З мэтай папярэджаньня пажараў, ад няспраўнасьці комінаў, печак, неасьцярожнага абыходжаньня з агнём і невыкананьня іншых супроцьпажарных мерапрыемстваў абавязаць усе домакіраўніцтва, арандатараў камунальных і ўласьнікаў прыватных домаўладаньняў як у гор. Менску, так і ў сельскай мясцовасьці гарадзкой мяжы:

а) Пэрыядычна праводзіць агляд становішча сталых і часовых печак, пліт, комінаў і інш. апалавых прыладаў і, ў выпадку заўважаных няспраўнасьцяй, безадкладна іх адрамантаваць, кіруючыся правіламі пажарнай аховы гораду, зьмешчаных у кантрольным пажарным часопісу.

б) Ля будынкаў, якія ацяпляюцца, устанавіць драбіны ад зямлі да страхі.

в) Да драўляных падлог каля кожнай печы, акрамя кухоных прыбіць з боку топкі бляху.

г) Штомесячна чысьціць каміны, а ў мясцох, дзе асабліва часта палиця печы, (у хлебапякарнях, сталоўках, лазьнях і г. д.) ня менш 2-х раз у месяц.

д) Аглядзець вадазборы, студні і бакі, якія маюцца ў дамаўладаньнях, ачышчаць іх ад забруджаньня і сачыць у далейшым за іх спраўнасьцю.

е) У выпадку пажара безадкладна паведамляць пажарную каманду (па тэл. № 9, або № 1-71—1-я частка, № 73—2-я частка—Серабранка і № 876—3-я частка—ў раёне таварнай станцыі).

ж) Для зьбіраньня попелу мець жалезныя скрынкі, або драўняныя абабітыя жалезам.

з) У гор. Менску завесьці спэцыяльныя кнігі (пажарна-кантрольны журнал) для прад'яўленьня інспэкцыі пажарнай аховы, агентам-кантралёрам і рабочым камінатрадаў, для праверкі і ўтварэньня адпаведных адзнакаў аб часе ачысткі комінаў і становішчы атапіцельных установак.

ЗАБАРАНЯЕЦЦА:

а) Сушыць лён, паклю у печах, а таксама часаць лён каля пячэй ў часе топкі.

б) Курыць у стайнях, на сенавалах, у гумнах і інш. памяшканьнях, дзе хаваюцца матар'ялы лёгка загараемыя.

в) Настаўляць самавары у сенцах і інш. небясьпечных у пажарных адносінах мясцох.

г) Гасіць вуглі ў драўняных пасудах, на драўлянай падлозе і каля драўняных сьценак.

д) Рабіць у жыльлёвых памяшканьнях і на гары сена, саломы, пянькі, лёну, газы, бэнзіны і інш. рэчаў, якія лёгка загараюцца.

е) Паліць сьмяцьцё, салому і інш. на вуліцах, дварах, у садох, гарадох, а таксама разводзіць вогнішча блізка будынкаў.

ж) Заграмаджаць разрывы паміж будынкамі рознымі матар'яламі.

з) Заліваць вадой каміны пры гарэньні сажы.

і) Устанаўляць часовыя пераносныя печы бяз пісьмовага дазволу пажарнай аховы гораду, а ў сельскіх мясцовасьцях—начальніка пажарнай дружыны адпаведнага населёнага пункту.

к) Высыпаць попел з жарам у драўляную пасуду, не абароненую ад загараньня, а таксама каля драўняных сьцен і платоў.

л) Адчыняць новыя майстэрні, прадпрыемствы, склады і інш. памяшканьні, якія маюць вялізарнае прызначэньне, без папярэдняга агляду іх пажарнай аховай і рэгістрацыі іх.

УВАГА: І існуючыя прадпрыемствы, склады і іншыя маючыя грамадзкае прызначэньне памяшканьні, якія яшчэ не зарэгістраваны і не агледжаны пажарнай аховай, павінны быць зарэгістраваны ў кіраўніцтве пажарнай аховы г. Менску ў двухтыднёвы тэрмін.

2. Пабудова новых будынкаў у сельскіх мясцовасьцях гарадзкой мяжы, маючых мясцовае значэньне, можа вытварыцца з дазволу сельсавету, а пабудовы, якія маюць прамысловае або грамадзкае значэньне—з дазволу кіраўніцтва пажарнай аховы гораду.

Пры пабудове новых будын